

ЯК ПРАЖЫЦЬ БЕЗ АЛІМЕНТАЎ

4

ПАЕХАЦЬ У ГЛЫБІНКУ І ЗАСТАЦЦА



МС

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

4 СТУДЗЕНЯ 2019 г.
ПЯТНІЦА
№ 2 (28869)

9-24 стар. МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ +TV ПРАГРАМА

**ЛІЧБА ДНЯ**

**145 дзяцей**

*нарадзілася ў Беларусі за першыя суткі новага года. У Мінску з'явілася на свет 36 малых. Першая ў гэтым годзе беларуска з'явілася на свет у Баранавічах у 00.15. У Мінску першае малое — хлопчык вагой 3990 грамаў — нарадзілася 1 студзеня ў 1.00 у РНПЦ «Маці і дзіця». «Мы сёння заклапочаны дэмаграфічнымі праблемамі, таму ўсе разам павінны матываваць маладыя пары на нараджэнне дзяцей», — сказаў Валерый МАЛАШКА, міністр аховы здароўя.*



**Кацярына, Аляксандр КУНЕВІЧЫ і іх маленькі сын Андрэйка, які стаў першым мінчанінам у 2019 годзе.**

## ЦЁПЛЫЯ СУСТРЭЧЫ НА МІНСКІМ ЛЁДЗЕ



**Учора кіраўнік дзяржавы Аляксандр Лукашэнка даў старт XV Каляднаму міжнароднаму турніру аматараў хакея і XXIII рэспубліканскім спаборніцтвам «Залатая шайба» на прызы Прэзідэнта Беларусі. На пляцоўках «Чыжоўка-Арэны» ў першы дзень ужо прайшло некалькі сустрэч, у тым ліку каманда Прэзідэнта Беларусі згуляла з камандай Міжнароднай федэрацыі хакея на лёдзе.**

Як адзначыў Аляксандр Лукашэнка, адкрываючы турнір, гэты спартыўны год асаблівы для нашай краіны, насычаны яркімі падзеямі будучых летніх спаборніцтваў II Еўрапейскіх гульняў. «А сёння адкрываем Калядны турнір. Першы матч мы правялі 15 гадоў таму, даўшы старт добрай традыцыі. І з кожным годам геаграфія ўдзельнікаў турніру пашыраецца. Тых, хто жадае прыехаць у Беларусь, становіцца ўсё больш. І, каб нікога з нашых сяброў не пакрыўдзіць, гэтым разам нам нават прыйшлося змяніць фармат спаборніцтваў. У турніры прымуць удзел ужо не восем, а дванаццаць камандаў», — падкрэсліў кіраўнік дзяржавы.

На мінскі лёд выйдуць хакеісты з балканскіх дзяржаў, Германіі, Кітая, Аб'яднаных Арабскіх Эміратаў, Расіі, Славакіі, Фінляндыі, Чэхіі, Швейцарыі, якія пастаянна ўдзельнічаюць у спаборніцтвах, а таксама іх новыя сапернікі — зборная Балтыі. Нават Міжнародная федэрацыя хакея сёлета сабрала каманду, каб уключыцца ў барацьбу за галоўны прыз.

«Гэты турнір унікальны. Ён наглядна дэманструе, што спорт аб'ядноўвае народы, нягледзячы на палітычныя крызісы і рознагалоссі», — звярнуў увагу Прэзідэнт, а таксама дадаў, што мінскі лёд сабраў мужчын, адданых хакею, моцных не толькі целам, але і духам, тых, хто шчыра жадае зрабіць свет лепшым.

Кіраўнік дзяржавы нагадаў пра дабрачынную акцыю, у якой удзельнічаюць знакамітыя спартсмены: «Велізарны вам дзякуй за спагадлівасць, добрыя, уважлівыя адносіны да нашых дзяцей — выхаванцаў дзіцячых дамоў. Вы ўсяляеце ў гэтых дзетак веру ў людзей, дапамагаеце ім адчуць сябе патрэбнымі, па-сапраўднаму шчаслівымі. І, вядома, сваім прыкладам даяце правільны арыенцір — прывіваеце інтарэс да здаровага ладу жыцця, любоў да вялікага спорту. Не выпадкова фінал рэспубліканскіх спаборніцтваў «Залатая шайба» стаў спадарожнікам турніру аматараў хакея. І гэта яшчэ адна добрая традыцыя».

Аляксандр Лукашэнка павіншаваў удзельнікаў спаборніцтваў і аматараў спорту з Новым годам і Калядамі святамі. А таксама пажадаў спартсменам паказаць захапляльную і рэзультатыўную гульню.

Калядны турнір прадоўжыцца пяць дзён. Пераможцы вызначацца ўвечары 7 студзеня.

**Надзея АНІСОВІЧ.**
**Фота БелТА.**




**XV Калядны міжнародны турнір стартаваў матчам Славакія — Швейцарыя.**

**КОРАТКА**

• Выплата пенсій і дапамог за 7 студзеня пачнецца ў аддзяленнях паштовай сувязі з 4 студзеня.

• **38—40 аўтамабіляў штодня вырабляецца за змену на галоўным канвееры Мінскага аўтамабільнага завода.**

• У Беларусі абноўлены пералік нехарчовых тавараў належнай якасці, якія не падлягаюць абмену і вяртанню.

• **У Беларускім дзяржаўным універсітэце плануецца ўвесці сацыяльныя зніжкі на абеды для студэнтаў.**



Нерухомасць

## Рост кошту «квадрата» — не больш за 10 %

### Аналітыкі ўпэўненыя: цэны на жыллё на працягу года будуць павышацца

**А яшчэ спецыялісты жыллёвага рынку сцвярджаюць, што тэндэнцыі Мінска ў той ці іншай меры датычацца кірункаў развіцця і рэгіёнаў. Наш эксперт — ганаровы старшыня Савета Беларускай асацыяцыі «Нерухомасць» Мікалай ПРАСТАЛУПАЎ — папярэджвае аб тым, што сёлета нас, хутчэй за ўсё, чакае вельмі нестабільны рынак. Падтрымліваць высокі попыт будзе складана: цэны на кватэры за крок ад зніжэння. Ва ўсякім разе, першыя дні новага года паказваюць, што цэны ўжо замерлі.**

Па словах суразмоўніка, мы пражылі вельмі незвычайны год, які склаўся з дзвюх абсалютна розных частак. Калі ў пачатку 2018-га сталічны рынак жыллёвай нерухомасці віраваў, у тым ліку і з-за росту даступнасці крэдытаў, то, пачынаючы з лета, агульная актыўнасць вярнулася ў нармальны стан. Сёння мы прааналізуем, што адбывалася апошнія 12 месяцаў, і прадставім сцэнарый развіцця сітуацыі.

### На піку актыўнасці

Па колькасці зарэгістраваных здзелак мінулы год з вялікай доляй імавернасці акажацца другім за ўсю гісторыю, толькі трохі саступіўшы свайму папярэдніку. У сярэднім кожны месяц на другасным рынку заключалі па 1150—1200 здзелак, пікавы попыт у 1400 здзелак прыйшоўся на люты і сакавік.

Забудоўшчыкі, агенцтвы нерухомасці і банкі аднназначна могуць занесці 2018-ы сабе ў актыў. Па выніках няпоўнага года аб'ём грошай, якія ўдзельнічалі ў абароце на «другасным рынку» і сегменце гатовых новабудоўляў, склаў 890 мільёнаў долараў. Гэта больш, чым за ўвесь мінулы год, і блізка да паказчыка 2014-га — максімальнага за ўвесь час назіранняў. Няма сумнення, што гэты рэкорд будзе пабіты.

Рост цэн на кватэры ў Мінску па выніках мінулага года склаў 8,4 %. Квадратны метр падаражэў у сярэднім на 200 рублёў. Зрэшты, сапраўдны рост скончыўся яшчэ ў красавіку, пасля чаго змены былі ледзь прыкметныя.

СТАР. 2

ISSN 1990 - 763X

# УМОВЫ ДЛЯ РЫЎКА

**Прэзідэнт Аляксандр Лукашэнка падпісаў Указ № 506 «Аб развіцці Аршанскага раёна Віцебскай вобласці», якім зацвярджаецца праграма развіцця гэтага рэгіёна на перыяд да 2023 года, паведамілі ў прэс-службе кіраўніка дзяржавы.**

У праграму ўключаны мерапрыемствы, накіраваныя на вырашэнне ключавых праблем Аршанскага раёна. Для гэтага плануецца рэалізаваць шэраг эканамічных, фінансавых, падатковых, адміністрацыйных і стымуляцыйных мер. Так, на тэрыторыі раёна ўстанаўліваецца адмысловы рэжым падаткаабкладання як для новых, так і для дзеючых суб'ектаў гаспадарання: прадпрыемствы будуць вызваленыя ад выплаты ПДВ пры ўвозе тэхналагічнага абсталявання, зніжающа стаўкі падатку пры спрошчанай сістэме падаткаабкладання да 1 %, памяншаюцца адлічэнні на пенсійнае страхаванне, а адтэрміноўка (растэрміноўка) па выплаце падаткаў будзе адбывацца без налічэння працэнтаў за яе выкарыстанне.

Акрамя таго, у праграме прадугледжаны меры для развіцця інвестыцыйнай дзейнасці. Напрыклад, для апаратыўнага прыняцця рашэнняў права на распараджэнне маёмасцю, якая неэфектыўна выкарыстоўваецца і знаходзіцца ў рэспубліканскай форме ўласнасці, даецца Аршанскаму райвыканкаму.

Для дадатковага разнявольвання дзелавой ініцыятывы ў Аршанскім раёне адбудзецца далейшае ўпарадкаванне праверачнай дзейнасці, а таксама дэкрыміналізацыя эканамічных рызык. Асобныя палажэнні ўказа накіраваны на матэрыяльнае стымуляванне працы кадраў шляхам увязкі ўзроўню заробтнай платы кіраўнікоў арганізацый і дзяржслужачых з вынікамі выканання праграмы развіцця Аршанскага раёна.

## Расказаць пра тое, што хвалюе

**Традыцыйныя прамыя тэлефонныя лініі па ўсёй Беларусі пройдуць у гэтую суботу, 5 студзеня. На сувязь з насельніцтвам выйдуць кіраўнікі ў рэгіёнах і Мінгарвыканкаме. Вынік такога дыялогу — аператыўнае вырашэнне надзённых пытанняў.**

**Тэлефонныя лініі з 9.00 да 12.00 правядуць:**

намеснік старшыні БРЭСЦКАГА аблвыканкама Вадзім Іванавіч АЛЬШЭЎСКІ. Тэл. 8 016 221 31 21;

намеснік старшыні ВІЦЕБСКАГА аблвыканкама Барыс Сяргеевіч ЯФРЭМАЎ. Тэл. 8 021 222 22 22;

першы намеснік старшыні ГОМЕЛЬСКАГА аблвыканкама Генадзь Міхайлавіч САЛАВЕЙ. Тэл. 8 023 233 12 37;

кіраўнік спраў ГРОДЗЕНСКАГА аблвыканкама Ігар Андрэевіч ПАПОЎ. Тэл. 8 015 273 56 44;

першы намеснік старшыні МАГІЛЁЎСКАГА аблвыканкама Мікалай Мікалаевіч КАРОЦІН. Тэл. 8 022 250 18 69;

намеснік старшыні МІНСКАГА аблвыканкама Іван Станіслававіч МАРКЕВІЧ. Тэл. 8 017 500 41 60;

намеснік старшыні МІНСКАГА гарвыканкама Ігар Віктаравіч ЮРКЕВІЧ. Тэл. 8 017 222 44 44.

# Рост кошту «квадрата» — не больш за 10 %

### Індыкатары рынку

На думку **аналітыка Арцёма САХАРЭВІЧА**, у многіх выпадках гаворка ўжо ідзе не аб далейшым росце рынку, а хутчэй аб падтрыманні стабільнасці.

Мяркуючы па апошняй інфармацыі Белстата, у мінулым годзе спыніўся рост колькасці насельніцтва Мінска. Гэта знакавы момант, бо ў былыя гады насельніцтва сталіцы штогод павялічвалася на 10—20 тысяч чалавек. У кароткатэрміновай перспектыве гэта не абяцае нейкіх узрушэнняў. Больш важнымі на цяперашні момант з'яўляюцца змены ва ўзроставай структуры жыхароў, а менавіта пікавая колькасць людзей ва ўзросце ад 25 да 35 гадоў, для якіх жыллёвае пытанне стаіць найбольш востра. Тым не менш стабілізацыя насельніцтва сталіцы на ўзроўні двух мільёнаў чалавек — гэта доўгатэрміновы трэнд, з якім прыйдзецца лічыцца ўсім гульцам рынку.

Сярэдняя заробатная плата летась павялічылася як у рублях, так і ў доларавым эквіваленце. У наступным годзе ў Нацыянальным банку не выключаюць росту валацільнасці курсаў, да таго ж рэгулятар усё больш актыўна праводзіць палітыку дэдаларызацыі (у тым ліку і на рынку нерухомасці). У такіх умовах разлічваць на павышэнне заробкаў у доларах будзе значна больш складана.

Рэальны дэфіцыт прапановы на сёння прысутнічае толькі ў сегменце гатовых навабудоўляў. Іх доля ў агульным аб'ёме здзелак куплі-продажу ў апошнія месяцы знаходзілася на рэкорднa нізкім узроўні — крыху больш за 6 %. Яшчэ год таму іх было каля 12 %, а ў пачатку 2015-га доля гатовых навабудоўляў даходзіла да 25 %. Гэта на руку другаснаму рынку — за адсутнасцю дастатковага выбару пакупнікі разглядаюць кватэры ў дамах, пабудаваных 3—5 гадоў таму. Летась іх доля ў агульным аб'ёме здзелак вырасла да самага значнага ўзроўню за апошняе дзесяцігоддзе.

### Крэдыты і зберажэнні

Найважнейшым вынікам апошніх трох гадоў можна назваць змену асноўнай крыніцы фінансавання ў пакупнікоў кватэр. Калі раней гэта былі ўласныя зберажэнні, то цяпер на першы план выходзяць крэдыты. Гэты пераход адбыўся даволі імкліва, а за кошт крэдытнага пляча колькасць патэнцыйных пакупнікоў у нейкі момант павялічылася да небывалых памераў, што пацягнула за сабой рэкордную колькасць здзелак.

Статыстыка Нацыянальнага банка наглядна дэманструе рост жыллёвага крэдытавання ў апошнія гады. У той жа час з'яўляецца некаторая неадпаведнасць паміж дынамікай попыту і крэдытавання. У 2017 годзе з ростам аб'ёмаў выдачы крэдытаў разганяўся попыт, што ў мінулым годзе ўжо не так відавочна. Выраслі цэны, многія банкі павялічылі камісію, але гэта таксама можа сігналізаваць аб тым, што ўласныя зберажэнні ў цяперашніх пакупнікоў ужо не такія значныя.

### Толькі двухпакаёвыя крыху патаннелі

Сярэдняя цана квадратнага метра кватэр, разлічаная паводле даных здзелак куплі-продажу, вырасла ў снежні на 0,2 % і склала 1215 долараў. Характэрна, што агульны рост быў дасягнуты за кошт трохпакаёвых кватэр, а таксама з-за павелічэння долі даражэйшых «аднапакаёвак». У большасці тыпаў кватэр у снежні пераважала адмоўная дынаміка.

Прагназуема ў апошні месяц года добрым попытам карысталіся аднапакаёвыя кватэры. Сярэдняя цана «квадрата» такога жылля складае 1340 долараў у эквіваленце, а сярэдняя цана кватэры — 48,5 тысячы долараў. Характэрна, што менавіта ў канцы снежня на рынку з'явілася адносна танныя аднапакаёўкі да 40 тысяч долараў. Гэта кватэры на крайніх паверхах дамоў і з агульнай плошчай у межах 33—35 квадратных метраў.

А вось кошт квадратнага метра двухпакаёвай кватэры за мінулы месяц нават злёгку «зваліўся» (мінус 8 %) і склаў 1260 долараў, або ў сярэднім 64,5 тысячы долараў за кватэру. Самыя танныя двухпакаёўкі на сталічным рынку сёння прапануюцца за 45—49 тысяч долараў. У гэтым выпадку пакупнікі могуць набыць «апартаменты» на першых — апошніх паверхах пяціпавярховых старых дамоў. Самы распаўсюджаны кошт двухпакаёвак знаходзіцца ў дыяпазоне ад 60 да 70 тысяч долараў.

Трохпакаёвыя кватэры нечакана падаражэлі (плюс 2,7 %), цяпер цана квадратнага метра роўная 1170 долараў, а кватэра каштуе ў сярэднім 80 тысяч долараў.

Мікалай Прасталупаў лічыць, што і сёлета рынак будзе развівацца як на арэлях. Па-першае, да 20 студзеня ніякіх здзелак проста не будзе. Кліенты актывізуюцца і пачнуць цікавіцца жыллём не раней за трэцюю дэкаду лютага. А ў сакавіку — красавіку банкі пачнуць больш актыўна выдаваць крэдыты пад фінансаванне будаўніцтва і нерухомасці. Хутчэй за ўсё, у гэты перыяд і адбудзецца не вельмі вялікае падаражанне (не больш за 10 %), але...

На думку эксперта, ужо ў другой палове года банкі пачнуць згортваць выдачу даступных крэдытаў для ўсіх ахвотных на фінансаванне набыцця нерухомасці. Попыт на жыллё будзе падаць, і цэны спыняць свой рост.

### Колькі слоў аб будаўніцтве

Мінбудархітэктуры скончыла падрыхтоўку пастановы па заробках будаўнікоў. Яны з 1 студзеня павялічваюцца, а значыць, варта чакаць падаражэння будаўніцтва.

З'явіўся праект Дырэктывы аб развіцці будаўнічай галіны. Сярод іншага там прадугледжана, што кошт квадратнага метра жылля, якое будуецца з дзяржаўнай падтрымкай, не павінен перавышаць памеру сярэднямесячнай заработнай платы. І яшчэ, выдатная навіна для тых, хто трапіў у падатковую пастку пасля продажу недабудаванага дома: цяпер такога падатку проста не будзе. Новы падатковы кодэкс ліквідуе заканадаўчы прабел.

**Сяргей КУРКАЧ.**

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Год малой радзімы

# Сталіцы ёсць чым ганарыцца

**— Малая радзіма мае асаблівае значэнне ў лёсе кожнага чалавека, — заўважае начальнік галоўнага ўпраўлення ідэалагічнай работы і па справах моладзі Мінскага гарвыканкама Сяргей ШЭНДЗІК. — Па словах Прэзідэнта Беларусі Аляксандра Лукашэнкі, «яна шматаблічная. Для адных гэта родны горад, вуліца ў горадзе ці невялікі дворык, вёска, дзе прайшлі найлепшыя дзіцячыя гады, для іншых — кавалачак дзікай прыроды, які цешыў вока і дарыў пачуццё напоўненасці і спакою. А для тых, хто з'ехаў шукаць шчасце ў іншыя краіны, малой радзімай стала Беларусь».**



Мінск — сталіца і самы буйны горад Беларусі, у якім пражывае каля двух мільёнаў чалавек (амаль 20 працэнтаў ад колькасці жыхароў рэспублікі). Моладзь сталіцы складае 26,8 % ад агульнай колькасці жыхароў горада Мінска. Сёння гэта сучасны, дынамічны рэгіён, які фарміруе 27 працэнтаў валавога ўнутранага прадукту Рэспублікі Беларусь.

Галоўнай крыніцай росту эканомікі сталіцы з'яўляецца прамысловасць, якой належыць бясспрэчнае першынство ў рэспубліцы па вытворчасці халадзільнікаў і мараразільнікаў, пральных машын, падшыпнікаў шарыкавых і ролікавых, ваўняных тканін, грузавых аўтамабіляў, аўтамабіляў-самазвалаў, трактароў, тэлевізараў, аўтобусаў, тралейбусаў.

У аснове дынамічнага развіцця сталіцы — рэалізацыя значных інавацыйных праектаў арганізацый Мінска, якія маюць падтрымку з бюджэту горада. Летась у рамках рэалізацыі інавацыйнага праекта УП «Адані» ўведзены ў эксплуатацыю Цэнтр стратэгічных інавацый і тэхналогій.

Немалаважным фактарам росту інавацыйнага бізнесу ў краіне з'яўляюцца навукова-тэхналагічныя паркі як пляцоўкі, на якіх ствараюцца ўмовы для арганізацыі і развіцця малых і сярэдніх інавацыйных высокатэхналагічных арганізацый. Знешні гандаль паслугамі ажыццяўляўся з 204 краінамі свету, экспарт — у 186 краін.

У рамках пашырэння міжнароднага супрацоўніцтва ў 2018 годзе праведзены Дні Мінска ў Тбілісі, Санкт-Пецярбургу, Будапешце. Дэлегацыя сталіцы прыняла ўдзел у першай Кітайскай міжнароднай выстаўцы імпартных тавараў і паслуг «China international import expo», на якой быў прадстаўлены стэнд Мінска ў рамках работы нацыянальнага павільёна Беларусі.

Будаўніцтва жылля, спартыўных, сацыяльных аб'ектаў і шматфункцыянальных комплексаў забяспечвае камфортныя ўмовы пражывання жыхароў сталіцы. Менавіта іх забудова дае магчымасць значна наблізіць узровень і якасць гарадскога асяроддзя да самых высокіх еўрапейскіх стандартаў.

Штогод у горадзе з'яўляюцца знакавыя аб'екты. 2018-ы не стаў выключэннем: Рэспубліканскі цэнтр алімпійскай падрыхтоўкі па мастацкай гімнастыцы, стадыён «Дынама», Мінскі гарадскі палац культуры. Першых выхаванцаў прынялі тры новыя дзіцячыя садкі ў розных раёнах горада. Школы-навабудоўлі расчынілі дзверы 1 верасня. Усе гэтыя будынкі сталі сапраўдным упрыгажэннем нашага горада, а таксама падарункам для сталічных медыкаў стаў дзевяціпавярховы інтэрнат у Цэнтральным раёне.

На тэрыторыі горада адкрылася больш за 100 новых велапаркоўак і велагаражоў.

У красавіку мінулага года на тэрыторыі геалагічнага помніка прыроды «Парк камянёў» стартавала экалагічная кампанія «Уладкуем малую радзіму!», у якой прынялі ўдзел кіраўнікі рэспубліканскіх органаў кіравання, а таксама спартсмены і артысты беларускай эстрады. Акрамя таго, навучэнцамі Мінскага дзяржаўнага мастацкага каледжа імя А. К. Глебава створаны арт-аб'ект, прысвечаны экалагічнай кампаніі і Году малой радзімы.

На базе Мінскага дзяржаўнага турыстка-экалагічнага цэнтра дзяцей і моладзі праведзены адкрытыя міжнародныя краязнаўчыя чытанні навучэнцаў і педагагічных работнікаў устаноў адукацыі сталіцы «Кожны з нас прыпасае радзімы куток, каб да старасці чэрпаць адтуль успаміны» (прадстаўлена да ўдзелу 218 работ).

Фестываль мастацкай і інтэлектуальнай творчасці «Мой Мінск — мая сталіца — творчасці і таленту крыніца!» аб'яднаў больш за 600 таленавітых навучэнцаў і педагогаў сталіцы. У рамках мерапрыемства былі прадстаўлены метадычныя распрацоўкі, праекты і творчыя работы ў намінацыях «Мінск. Старонкі гісторыі» і «Ілюстрацыі да твораў беларускіх і рускіх пісьменнікаў і паэтаў».

У пачатку навучальнага года ва ўстановах адукацыі сталіцы стартавала гарадская культурна-адукацыйная акцыя «Мінск — горад-герой, горад тваёй будучыні», у рамках якой прайшлі тэматычныя ўрокі «Мінчане года: праца і творчасць — любімай сталіцы» з удзелам жыхароў сталіцы, удастоеных звання «Мінчанін года». На працягу года навучэнцы сталіцы актыўна ўдзельнічалі ў конкурсах віртуальных музеяў устаноў адукацыі «Гістарычная спадчына малой радзімы», юных экскурсаводаў «З чаго пачынаецца Радзіма...», даследчых работ «Спадчына Беларусі».

Летась бібліятэкамі г. Мінска праведзена 456 мерапрыемстваў, прысвечаных Году малой радзімы (кніжныя выстаўкі, фотавернісажы, прэзентацыі кніг, гістарычныя экскурсы, інтэрактыўныя гульні, літаратурныя святы). Беларускім культурным цэнтрам духоўнага Адраджэння арганізавана праца па вывучэнні гісторыі нацысцкага лагера смерці «Трасцянец» і экскурсійным абслугоўванні мемарыяльнага комплексу «Трасцянец».

Для зручнасці турыстаў укаранёны праект «Картка госця горада Мінска», якая дае правa на льготных умовах наведваць аб'екты турыстычнай цікавасці, а таксама бязлімітны праезд на наземным грамадскім транспарце з тэрмінам дзеяння да 12 месяцаў. У мэтах папулярызацыі гісторыка-культурнай спадчыны, самабытных традыцый рэгіёна суб'ектамі турыстычнага бізнесу сталіцы ствараюцца тэматычныя туры і экскурсійныя праграмы. Для жыхароў і гасцей сталіцы паспяхова функцыянуюць аўтобусныя праекты «Мінск экскурсійны» і «Мінск Сіці тур» з аўдыягідамі на дзевяці мовах свету.

**Сяргей КУЛАКОЎ.**

Чулі?!

# У Беларусі ўпершыню выпусцілі бензін з актанавым лікам 100

**Мазырскі НПЗ атрымаў станоўчыя вынікі выпрабаванняў доследна-прамысловай партыі бензіну АІ-100-К5-Еўра, паведамілі БелТА на прадпрыемстве.**

АІ-100-К5-Еўра распрацоўваўся для прымянення ў рухавіках аўтамабіляў любога тыпу, вытворцамі якіх у інструкцыі па эксплуатацыі паказаны актанавы лік не менш за 95. Новы бензін Мазырскага НПЗ можна выкарыстоўваць у любых стандартных аўтамабілях.

«Пры выкарыстанні АІ-100-К5-Еўра павышаецца ККД рухавіка, што прыводзіць да паляпшэння хуткасных характарыстык аўтамабіля. Рухавік працуе больш эфектыўна і больш устойліва ў вялікім дыяпазоне абаротаў. АІ-100-К5-Еўра дазваляе атрымаць максімальную магутнасць, палягчае запуск і зніжае ўдзельны расход паліва», — адзначылі на Мазырскім НПЗ.

Акрамя таго, паніжанае ўтрыманне серы, бензолу і араматычных вуглевадародаў памяншае карозію на дэталях аўтамабіля. Збалансаваны фракцыйны склад паліва зніжае колькасць шкодных выкідаў у атмасферу.

Як чакаецца, новы від бензіну стане даступны на беларускіх запраўках, а таксама будзе пастаўляцца на экспарт. На прадпрыемстве звярнулі ўвагу, што выпуск новага віду маторнага паліва на Мазырскім НПЗ стаў магчымы дзякуючы мадэрнізацыі вытворчых магутнасцяў і ўкараненню сучасных тэхналогій.

### Дарэчы

**На АЗС «Беларуснафты» знізіліся цэны — на дызельнае паліва на 1 капейку і бензін — на 2 капейкі. Аб гэтым паведамляецца на афіцыйным сайце кампаніі.**

**На запраўках «Беларуснафты» з 3 студзеня кошт 1 літра бензіну АІ-95-К5 складае Br1,52, бензіну АІ-92-К5 — Br1,41, дызельнае паліва каштуе Br1,53 за 1 літр. Як растлумачылі ў канцэрне «Белнафтахім», астатнія сеткі АЗС таксама маюць права знізіць у сябе цэны на паліва. «Мы усталёўваем гранічныя максімальныя цэны, а АЗС могуць даваць зніжкі», — адзначылі ў канцэрне.**

Надвор'е

# МАРОЗ І СОНЦА

## На Каляды чакаецца да мінус 18 градусаў

**Зіма ўзмацняе свае пазіцыі, а ў найбліжэйшыя дні ў нашай краіне чакаецца марозное надвор'е са снегам, паведамілі спецыялісты Рэспубліканскага цэнтра па гідраметэаралогіі, кантролі радыеактыўнага забруджвання і маніторынгу навакольнага асяроддзя Мінпрыроды.**



Галалёдзіца і маразы да мінус 13 градусаў чакаюцца ў нас у выхадныя, сказалі ў Белгідрамецэ. Сёння днём надвор'е будзе вызначаць няўстойлівая паветраная маса, якая паступае з Балтыйскага мора. Месцамі пройдзе кароткачасовы снег. На асобных участках дарог чакаецца галалёдзіца. Тэмпература паветра складзе ад мінус 1 да мінус 6 градусаў. У суботу і нядзелю надвор'е будзе вызначаць цыклон, шлях якога з поўначы Еўропы пройдзе праз тэрыторыю Беларусі на поўдзень Украіны.

У многіх раёнах краіны ў суботу чакаецца снег, мокры снег, месцамі слабая мяцеліца, днём па захадзе слабы галалёд. На некаторых участках дарог магчыма галалёдзіца. Тэмпература паветра ўначы складзе 4—11 марозу, але па захадзе не апусціцца ніжэй за мінус 1—3 градусы. Днём тэмпература будзе знаходзіцца ў межах ад мінус 6 па паўночным усходзе да плюс 2 градусаў па захадзе.

Сапраўдныя халады пачнуць паступаць да нас 6 студзеня. У нядзелю ўначы і раніцай на большай частцы тэрыторыі краіны, днём месцамі пройдзе кароткачасовы снег. На асобных участках дарог чакаецца галалёдзіца. Тэмпература паветра на працягу сутак складзе 4—10 марозу, уначы па паўночным усходзе панізіцца да мінус 11—13 градусаў.

На Каляды, у панядзелак, тэрыторыя краіны апынецца пад уплывам вобласці павышанага атмасфернага ціску. Уначы ў некаторых раёнах не абыдзецца без невялікага кароткачасовага снегу, днём будзе пераважна без ападкаў. На дарогах месцамі чакаецца галалёдзіца. Тэмпература паветра ўначы складзе 8—14 градусаў марозу, пры праясненнях панізіцца да мінус 15—18 градусаў. Днём будзе ад мінус 6 да мінус 12 градусаў. Зіма. Сапраўдная. Прыйшла.

**Сяргей КУРКАЧ.**

Добрая навіна

# Пазбавіць ад трывогі

**Акцыя аказання спонсарскай дапамогі па абсталяванні ўстаноў адукацыі «трывожнымі кнопкамі» з дапамогай Дэпартамента аховы праводзіцца Міністэрствам унутраных спраў з 2015 года. Яна ахапіла ўжо 595 аб'ектаў па ўсёй краіне. У Гродзенскай вобласці да спіса далучыліся яшчэ 59 адукацыйных устаноў. Там скончылі мантаж і настройку тэхнічных сродкаў сувязі і сістэм аховы, якія падключылі на пульт цэнтралізаванага назірання падраздзяленняў дэпартамента.**

Адным з тых аб'ектаў, дзе ўсталявалі «трывожную кнопку», стаў яслі-сад № 85, што ў Гродне. Цяпер у выпадку неабходнасці вартаўнік можа выклікаць нарад групы затрымання, не здымаючы тэлефоннай трубкі.

— Дзякуючы гэтай ініцыятыве ў спалучэнні з дабрачыннасцю бацькі будуць адчуваць сябе спакайней, знаходзячыся на сваіх рабочых месцах, — заўважыў **начальнік Гродзенскага абласнога ўпраўлення Дэпартамента аховы Алег ГІШКО.** — Бо дзеці — гэта самае дарагое, што ў нас ёсць, і трэба зрабіць усё дзеля іх бяспекі.

Загадчыца дашкольнай установы Ірына Дабрэнка падзякавала супрацоўнікам Дэпартамента аховы за такую патрэбную і добрую справу.

**Сяргей КУЛАКОЎ.**

# МАСТАЦКАЕ СЛОВА ЯК ДАРОГА ДА ЯДНАННЯ

**Міжнародны сімпозіум літаратараў «Пісьменнік і час» у лютым 2019 года пройдзе ў Мінску ўжо пяты раз.**

Сёлета на сустрэчу беларускіх і замежных паэтаў, празаікаў, публіцыстаў, літаратуразнаўцаў збяруцца калегі болей як з 20 краін свету. Арганізатары творчага праекта — Міністэрства інфармацыі Рэспублікі Беларусь, Саюз пісьменнікаў Беларусі, Выдавецкі дом «Звязда» і выдавецтва «Мастацкая літаратура». Госці з розных краін, як правіла, — з кагорты тых літаратараў, якія ўжо добра ведаюць Беларусь і беларускую літаратуру, прыўнеслі свой асабісты ўклад у прапаганду беларускага мастацкага слова ў сваіх краінах, на сваіх родных мовах.

З Азербайджана, напрыклад, прыедуць пісьменнікі з Цэнтра перакладаў пры Кабінеце міністраў Азербайджанскай Рэспублікі — Афаг Масуд і Яшар Алiеў. Чакаецца вялікая пісьменніцкая дэлегацыя з Казахстана — дырэктар выдавецкага дома «Жыбек Жалы» паэт і перакладчык Бахытжан Канап'янаў, доктар філалагічных навук празаік Нурдаўлет Акыш, намеснік галоўнага рэдактара часопіса «Простор» паэтэса Любоў Шашкова, літаратуразнаўца Святлана Ананьева, дырэктар Інстытута літаратуры і мастацтва імя М. Аўэзава Кенжэхан Матыжанаў. Заўважым, што і з Азербайджанам, і з Казахстанам у апошнія гады склаліся добрыя літаратурныя стасункі. У Баку выдадзены шэраг кніг беларускіх аўтараў у перакладзе на азербайджанскую мову — Алеся Бадака, Анатоля Матвіенкі, Мікалая Чаргінца. Казахстанскі часопіс «Простор» неаднойчы рыхтаваў для свайго чытача «беларускія выпускі».

Для абмеркавання надзённых пытанняў культурнага, гуманітарнага супрацоўніцтва ў Мінск прыедуць і пісьменнікі Кітая, ЗША, Манголіі, Літвы, Латвіі, Кыргызстана, Узбекістана, Польшчы... Досыць прадстаўнічай на сімпозіуме «Пісьменнік і час» будзе і дэлегацыя з Расійскай Федэрацыі.

**Мікола РАЎНАПОЛЬСКІ.**

## ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

### Жыхары Бельгіі дагэтуль не абмянялі на еўра 16 мільярдаў франкаў



Бельгія перайшла на еўра са студзеня 2002 года, аднак жыхары каралеўства да гэтага часу не абмянялі на адзіную еўрапейскую валюту 16 мільярдаў бельгійскіх франкаў, што эквівалентна прыкладна 400 мільёнам еўра, паведаміў Нацыянальны банк Бельгіі (BNB). Еўра стаў афіцыйнай валютай 11 краін Еўрасаюза з 1 студзеня 1999 года. Пры гэтым у першыя тры гады быў «нябачны» — выкарыстоўваўся ў электронных плацяжах, а з 1 студзеня 2002-га паступіў у наяўны абарот і замяніў нацыянальныя валюты. Па звестках газеты Echo, у Бельгіі пасля пераходу на еўра пакупніцкая здольнасць насельніцтва, у параўнанні з іншымі краінамі еўразоны, вырасла ў меншай ступені — у сярэднім на 0,38 % на працягу кожнага года з моманту паступлення еўравалюты ў наяўнае абарачэнне. Больш нізкі паказчык толькі ў Грэцыі і Італіі. Прычынай зніжэння пакупніцкай здольнасці сярэднестатыстычнай бельгійскай сям'і эксперты называюць сусветны фінансавы крызіс 2008—2009 гадоў, высокі ўзровень інфляцыі і рост цэн на энерганосьбіты.

### Экспарт венесуэльскай нафты летась знізіўся да мінімуму за 28 гадоў

Венесуэла экспартавала летась у сярэднім усяго 1,245 млн барэляў нафты ў суткі. Гэта мінімальны аб'ём за 28 гадоў з-за падзення здабычы на фоне эканамічнага крызісу, паведамляе агенцтва Bloomberg. Здабыча нафты ў Венесуэле, уладальніцы найбуйнейшых у свеце разведаных запасаў гэтай сыравіны, па даных АПЕК за апошнія пяць гадоў упала больш чым у два разы. Пастаўкі «чорнага золата» з'яўляюцца галоўнай крыніцай даходаў бюджэту гэтай краіны. Такім чынам, скарачэнне экспарту толькі пагаршае крызіс у Венесуэле, якая знаходзіцца пад амерыканскімі санкцыямі і пад ціскам з боку крэдытораў, якія настойваюць на адабранні венесуэльскіх актываў, уключаючы грузы нафты і нафтаперапрацоўчы бізнес у ЗША.

### На адваротным баку Месяца сеў кітайскі беспілотнік



Кітайскі беспілотны апарат «Чан'э-4» мякка сеў на адваротным баку Месяца. Гэта першая касмічная станцыя, якая прылунілася на малавывучаную тэрыторыю зямнога спадарожніка, паведаміла РІА Навіны. На борце знаходзіцца месяцаход, які правядзе даследаванні і эксперыменты, у тым ліку вопыты па вырошчванні арганізмаў ва ўмовах малой сілы цяжару. «Чан'э-4» высадзіўся ў басейне Эйткена ў раёне Паўднёвага полюса спадарожніка Зямлі, які з'яўляецца найбуйнейшым з ударных кратараў у Сонечнай сістэме. Ён быў запушчаны з касмадрома Січан у кітайскай правінцыі Сычуань 8 снежня. Запуск «Чан'э-4» стаў чарговым этапам кітайскай праграмы па даследаванні Месяца, што стартавала ў сакавіку 2003 года і атрымала назву па імені гераіні кітайскіх легендаў, якая здабыла неўміручасць і ўзнеслася на Месяц. Першай місіяй праграмы стаў запуск аўтаматычнай месяцавай станцыі «Чан'э-1» у кастрычніку 2007 года. Станцыя прапрацавала на арбіце спадарожніка Зямлі 16 месяцаў, з яе дапамогай была складзена трохмерная карта паверхні Месяца з высокім раздзяленнем. У 2019 годзе Кітай плануе адправіць да Месяца АМС «Чан'э-5», у задачу якой увойдзе ўзяцце каля 2 кг месяцавага грунта і дастаўка яго ўзорам на Зямлю. Затым плануецца запусціць дзве аўтаматычныя станцыі для ажыццяўлення пасадкі на Паўднёвы і Паўночны полюсы Месяца. У планы КНР уваходзіць адпраўка на спадарожнік сваіх касманаўтаў (тайканаўтаў) да 2036 года.

Як нас дураць

# «Гульня» на матчыных пачуццях

## Тэлефонныя ашуканцы выманілі ў пенсіянеркі з Гродна 3 тысячы долараў

**Як паведамілі ва УУС Гродзенскага аблвыканкама, у канцы снежня 86-гадовай жыхарцы абласнога цэнтра патэлефанаваў мужчына, прадставіўся яе сынам і расказаў, што трапіў у непрыемную сітуацыю. Затым тэлефонную трубку ў «сына» ўзяў нібыта супрацоўнік праваахоўных органаў, які заявіў, што інцыдэнт можна ўладзіць за 6 тысяч долараў.**

Ён даў рэквізіты банка, куды трэба перавесці грошы, і нумар, па якім трэба патэлефанаваць пасля грашовага пераводу. Дарэчы, гэты нумар быў зарэгістраваны на тэрыторыі Літвы. У пенсіянеркі патрабаванай сумы не знайшлося, мелася толькі 3 тысячы долараў, іх яна і пераявіла на рахунак. Пазней высветлілася, што яе сын знаходзіцца ў Беларусі і ніякіх «інцыдэнтаў» з ім не адбывалася. Жанчына стала ахвярай махляроў. Даведаўшыся пра гэта, яна звярнулася ў праваахоўныя органы. Па гэтым факце ўзбуджана крымінальная справа па ч. 3 арт. 209 КК Рэспублікі Беларусь (махлярства).

Падобныя злачынствы ўжо адбываліся на тэрыторыі Гродзенскай вобласці ў 2017—2018 гадах. Работнікі міліцыі звяртаюць увагу на неабходнасць папярэджваць сваіх сваякоў (найперш — пажылых) аб магчымасці здзяйснення ў дачыненні да іх такога роду махлярства.

**Сяргей КУЛАКОЎ.**

Ракурс

# ПРАКАРМІЦЬ-АПРАНУЦЬ... А ЯК?

## Гараджанка жыве ва ўмовах хранічнага недаатрымання аліментаў

**Ганна згадзілася на размову пры дзвюх умовах: па-першае, ніякіх прозвішча, месца работы, адраса, па-другое, ніякіх здымкаў. Яна саромеецца цяперашняга ладу жыцця сваёй сям'і, усе цяжкасці лічыць часовымі. Спадзяецца, што ў найбліжэйшы час іх матэрыяльнае становішча выправіцца, бо яна зноў уладкавалася на работу ды знайшла падпрацоўку. І наогул яна — маці дваіх дзяцей, таму павінна быць моцнай. Ганна, як няцяжка здагадацца, таксама не яе імя, яна папрасіла назваць менавіта так. Вось яе гісторыя з пэўнымі скарачэннямі.**



Фота носіць ілюстрацыйны характар.

— Калі б мама была жывая, усё выглядала б інакш, — пачынае свой расказ маладая жанчына. — Яна наогул была супраць нашага шлюбу з Вадзімам. Я не разумела: такі прыгожы, дасціпны, душа любой кампаніі, дзе б ён ні павярнуўся, вакол яго ўзнікаюць людзі. Работу часта мяняў, гаварыў, што яму хутка надакучвае аднастайнасць. Вось гэта ўсё маме і не падабалася. А я была закаханая, мне здавалася, усе будуць зайздросціць...

Ну і першыя гады жылі добра. Нарадзіліся адзін за адным двое сыноў. Муж працаваў то ў адной, то ў другой транспартнай кампаніі. Я выйшла з дэкрэтнага ў сваю швейную фірму. Не ведаю нават, з чаго ўсё пачалося, і не скажу, што ён надта многа выпіваў, не было асабліва і сварак. Проста, відаць, ён сапраўды не можа доўга на адным месцы. Адным словам, муж сабраў рэчы і сышоў. Я была ў такім шоку, што доўга нават на спагнанне аліментаў не падавала. Думала, сам чалавек павінен усвядоміць свой бацькоўскі абавязак. Ён і праўда напачатку з'ехаў за мяжу і прысылаў час ад часу нейкія капейкі. Потым усё ж — не без настойлівай падказкі мамы — я знайшла ў сабе сілы падаць дакументы на спагнанне аліментаў. Першы год выплаты прыходзілі рэгулярна... А потым захварэла мама, як не стала літаральна за два месяцы. Гэтая страта мяне і падкасіла. Я таксама трапіла ў бальніцу. І з ранейшай работай давялося развітацца. Выседзець змену за швейнай машынай, сагнуўшы спіну, мне аказалася надта цяжка. Ды і зарплаты ў нас упалі.

Нейкі час я была без работы, гэта з'ела апошнія запасы-зберажэнні. У нас у сям'і не было прынята жыць упрытык, заўсёды нешта адкладвалася на ўсялякі выпадак. А тут вось так выйшла. Аліменты больш не прыходзілі. Я пайшла да судовага выканаўцы, які накіраваў мяне ў міліцыю. Майго былога мужа сталі шукаць як аліментшчыка-даўжніка.

Як аказалася, раней ён папрацаваў у Польшчы, Іспаніі, іншых краінах Еўропы, а на час пачатку пошукаў жыў у сваім горадзе ў іншай жанчыны. Пасля візіту ўчастковага з даўгамі па аліментах разлічыўся, але на работу ўладкоўвацца не спяшаўся, вось даўгі сталі расці зноў. У рэшце рэшт яму абмежавалі выезд з краіны. Цяпер ён гаворыць — найбольш, праўда, міліцыянерам, — што і ехаў туды, каб мець высокааплатную работу і лепш падтрымліваць сваіх дзяцей. Толькі я ў гэта не асабліва веру, бо і па ранейшых даўгах за час работы ў Еўропе ён разлічыўся пасля таго, як да яго завітаў судовы выканаўца, а потым і нарад міліцыі.

Начальнік аддзела вышуковай работы нашага РАУС — чалавек чулы, ён нам, гаротніцам, спачувае, кажа раз: «Калі хочаш, мы яго пасадзім». Але што мне з таго, што ён будзе сядзець у турме? Мне трэба дзяцей карміць-апранаць. Я не імкнуся караць турмою чалавека, які здрадзіў мне і сваім дзецям. Як кажуць, Бог — суддзя. Я ўжо ўладкавалася на работу ў дзіцячы садок нянечкай. Яшчэ знаёмая прадпрымальніца-швачка дапамагае заказамі. Я ўмею шыць і спадзяюся, што хутка пачну не проста зводзіць канцы з канцамі, а нармальна ўтрымліваць сваіх дзяцей. Цяпер успомніць страшна, як здаралася, што ў нас на цэлы дзень быў толькі кілаграм бульбы, нават без кефіру. І як я першы раз пайшла ў дом дабрачыннасці па адзенне для сыноў. Там, дарэчы, працуюць вельмі добразычлівыя пенсіянеркі, яны дапамаглі падабраць абутак, курткі, штаны для дзяцей. Заўважылі маю разгубленасць, супакоілі... Ведаеце, вельмі нават прыстойныя рэчы людзі аддаюць. Калі самому можна насіць адзенне хоць дзясятак гадоў, то дзецям трэба набываць нешта перыядычна, яны ж растуць. І гэты дабрачынны дом, што ёсць у нас у горадзе, выйсце для многіх...

Дык вось у выніку я зразумела, што ў нас няма гарантавана дзейснага механізма спагнання аліментаў. Мне міліцыянеры такія дзіўныя гісторыі расказвалі пра гэтых самых неплацельшчыкаў, што смех і грэх. А потым я ў газеце прачытала, як пракурор на адной нарадзе сказаў нешта накшталт «трэба стварыць вакол неплацельшчыкаў абстаноўку нецярпімасці».

Але хто і як яе будзе ствараць? Мне расказвалі, як чужыя людзі хавалі неплацельшчыкаў у кошыку для бялізны, у сваім гаражы. А вы кажаце, абстаноўка нецярпімасці... Цяпер — кожны за сябе. Шкада толькі, што нашы гісторыі не становяцца ўрокам для тых самых маладых дурніц, якой была і я, калі выходзіла замуж. Трэба больш уважліва і адказна ставіцца да выбару таго, хто стане бацькам тваіх дзяцей. Цяпер я добра разумею сваю маці, якая перасцерагала ад паспешлівага кроку.

Зараз вось застаецца выбіваць тыя аліменты з дапамогай праваахоўных органаў. У былога мужа фармальна няма ніякай нерухомасці, нават асабістых рэчаў, такіх як бытавая тэхніка, камп'ютары, аўтамабіль. Хоць нашы агульныя знаёмыя мне гаварылі, што з-за мяжы ён шмат чаго прывёз. Але ўсё гэта стала ўласнасцю яго грамадзянскай жонкі. Пражывае ён на яе жылплошчы. Што з чалавека возьмеш? А калі ён нават уладкуецца на работу з зарплатай у 300 рублёў і будзе прысылаць капейкі, то яны не стануць дзейсная падтрымкай дзецям, — заключыла Ганна.

...Такая вось, крыху сумбурна выкладзеная, невясёлая гісторыя, што адлюстроўвае адну з вельмі надзённых праблем нашага грамадства і выкрывае як мінімум два яе аспекты. Сапраўды, няма дзейснага спосабу спагнання аліментаў, не выпрацавала яго наша грамадства. І ад гэтага пакутуюць дзеці. Здараецца, проста недаядаюць, недаатрымліваюць у сваім развіцці, выхаванні, бо не могуць наведваць у поўнай меры гурткі, секцыі, дадатковыя заняткі. Дзеці Ганны, дарэчы, хоць і на кароткі час, але трапілі ў спіс тых, хто знаходзіцца ў сацыяльна небяспечным становішчы. Пасля ўладкавання яе на работу іх знялі з уліку.

Гераіня спасылаецца на выказванне пракурора Брэсцкай вобласці, якое растыражавалі СМІ. Сапраўды летась пракуратура Брэсцкай вобласці праводзіла каардынацыйную нараду па барацьбе са злачыннасцю і карупцыяй. На ёй уздымаліся пытанні несвоечасовай выплаты аліментаў. Таму пракуратура і забіла трывогу, што колькасць неплацельшчыкаў стала расці. І з гэтага вынікаюць негатыўныя наступствы. Прыводзіліся, напрыклад, такія факты: за два гады колькасць дзяцей, якія стаяць на ўліку ў ІСН, чые бацькі ўхіляюцца ад аплаты аліментаў, вырасла ў тры разы, а тых, хто знаходзіцца ў сацыяльна небяспечным становішчы, стала ў паўтара раза больш. Як устаноўлена, кожны трэці неплацельшчык вядзе асацыяльны лад жыцця і ўяўляе сабой той кантынгент, з якога нічога не возьмеш. З іншымі ж можна весці работу, паводле слоў **пракурора Віктара КЛІМАВА**, у тым ліку ідэалагічнымі метадамі. Вядома, работа праводзіцца ўсімі зацікаўленымі службамі і дае пэўныя вынікі. Тэмпы ўказанага росту запаволіліся. Але неплацельшчыкаў па-ранейшаму многа, толькі за пазамінулы год за ўхіленне бацькамі ад утрымання дзяцей у рэгіёне заведзена 940 крымінальных спраў, 740 — за 11 месяцаў 2018-га.

**Святлана ЯСКЕВІЧ.**

---

## «Да навін як да глытка вады...»

**Докшыцкай раённай «Родныя вытокі» споўнілася 75 гадоў!**

Газета пачынала свой шлях у ваенным 1943-м у Бягомлі, яна была рупарам партызанскай брыгады «Жалязняк» і органам падпольнага райкама КПБ.

Сёння нашы «Родныя вытокі» — адна з найлепшых раённых газет у Віцебскай вобласці. Таму не дзіва, што павіншаваць яе прыйшлі сотні падпісчыкаў і прыхільнікаў, прадстаўнікі працоўных калектываў, райвыканкама і раённага Савета дэпутатаў.

Вельмі кранальным было ўшанаванне ветэранаў друку, за што мы шчыра ўдзячныя калектыву Саюза журналістаў і асабіста старшыні Докшыцкага райвыканкама Алегу Пінчуку.

**М. Ф. Аўтух, рэдактар газеты з 1992-га да 2004 года,**
*г. Докшыцы.*

---

Добрыя справы

# Не носіш сукенку? Перадай другому

## У Мінску ўстанавілі кантэйнеры для збору адзення і абутку

**Рэчы, якія кладуць туды, пасля перадаюцца малазабяспечаным грамадзянам. Такія кантэйнеры — распаўсюджаная ў свеце практыка. Іх можна ўбачыць у ЗША, Германіі, Польшчы. У Беларусі іх устанавілі па ініцыятыве Чырвонага Крыжа. Першыя з'явіліся ў Гомельскай вобласці яшчэ тры гады таму. Потым далучылася Брэстчына. А цяпер кантэйнеры для збору рэчаў з'явіліся ў сталіцы: на вуліцы Казіміраўскай, 39, Акадэмічнай, 34 і Баравой, 7.**




Кантэйнеры з'явіліся на трох сталічных аўтазапраўках.

— Калі ў Гомельскай і Брэсцкай абласцях яны знаходзяцца ў жылых раёнах, то ў Мінску мы ўстанавілі іх на аўтазаправачных станцыях. Справа ў тым, што не ўсе ставяцца да кантэйнераў беражліва. Акты вандалізму здараюцца часта: боксы пашкоджваюць, спрабуюць адчыняць, падпальваць. Мы ўлічылі гэты вопыт і вырашылі змясціць іх пад відэаназіранне. Мы ўлічылі гэты вопыт і вырашылі змясціць, дзе б кантэйнеры былі пад відэанаглядам, — кажа **намеснік генеральнага сакратара Беларускага таварыства Чырвонага Крыжа Раманія СКАМАРОШКА.**

У боксы можна пакласці чыстыя адзенне і абутак — як тыя, што былі ва ўжытку, так і новыя, якія вы некалі набылі сабе, але так і не насілі. Пажадана, каб усё было запакавана ў поліэтыленавыя пакеты. Зімой асабліва актуальныя цёплыя рэчы: курткі, паліто, світары, шапкі, шалікі, пальчаткі, боты на нізкім ходзе.

— Калі размова пра ўжываныя рэчы, то мы заўсёды просім, каб яны былі ў прыдатным для нашэння стане. На жаль, большасць адзення, якое мы вымаем з кантэйнераў, нельга аднавіць: яно бруднае, парванае, паточанае моллю. Чым кіруюцца тыя, хто такія рэчы нам прыносіць, мы не ведаем. Але не адчайваемся і спадзяёмся на ўзаемапавагу, — заўважае Раманія Скамарошка.

Акрамя адзення, у боксы можна апусціць сумкі, рукзакі, цацкі, коўдры, пакрывалы.

Кантэйнеры адчыняюць па меры іх запаўнення — у сярэднім раз на тыдзень. Выманнем і сартаваннем займаюцца супрацоўнікі і валанцёры Чырвонага Крыжа. Пасля рэчы перадаюць малазабяспечаным адзінокім старым, шматдзетным, апякунскім і прыёмным сем'ям, сіротам, людзям з інваліднасцю, ахвярам надзвычайных і крызісных сітуацый, бежанцам, вымушаным перасяленцам. Больш за ўсё запатрабаваны мужчынскія адзенне і абутак, пасля — дзіцячыя рэчы.

Каб паставіць больш кантэйнераў па ўсёй краіне, Чырвоны Крыж спадзяецца прыцягнуць партнёраў.

— Кошт вырабу і ўстаноўкі аднаго бокса цяпер складае больш за 800 рублёў. І калі выбіраць паміж кантэйнерамі і аплатай работы некалькіх сясцёр міласэрнасці, якія даглядаюць пяць-сем падапечных, то наша арганізацыя аддасць прыярытэт другому. Таму мы працягваем шукаць магчымасці для супрацоўніцтва.



Рэчы павінны быць чыстымі і прыдатнымі для нашэння.

**Наталля ЛУБНЕЎСКАЯ.**
**Фота Ганны ЗАНКАВІЧ.**




## ПЕЛЬМЕНІ З БЕЛЫМ... СНЕГАМ

Пасля першых жа праглядаў мастацкай стужкі «Іронія лёсу, або З лёгкай парай!» у лазню на фінішы года пайшлі многія, у тым ліку і Міхал Пятровіч. З часам да яго далучыліся старэйшы сын Андрэй і сусед па лесвічнай пляцоўцы Косця. Разам яны парыліся-мыліся, разам адпачывалі і душой, і целам. Адзінае, у адрозненне ад герояў кіно, не пілі — нават піва.

Дык вось на календары было 31 снежня. Мужчыны прыцемкам і пехам вярталіся з лазні. Машыну пакінулі на стаянцы, бо ведалі, што бліжэй да пад'езда ў гэты час наўрад ці прыпаркуешся. Ды і небяспечна ў навагоднюю ноч, бо хто-небудзь п'яны можа выламаць бакавое люстэрка (як гэта ўжо здаралася) альбо пашкодзіць кузаў петардай...

Да свайго двара мужчыны дайшлі моўчкі (хіба белы снег парыпваў пад іх чаравікамі). А ўжо там машынальна зірнулі на ўласныя вокны, балазе гэта нізка — першы паверх.

Аднак што гэта — нехта пад імі поўзае?

Пераглянуліся, сцішылі хаду.

— І што мы тут шукаем? — спытаў Косця, падышоўшы бліжэй. — Злая мачаха выправіла падснежнікі збіраць?

— Не, гэта я свайму Васю хацела падарунак зрабіць, — шмыгаючы носам, прагаварыла Ліза, іх суседка зверху. — Пяльмешак наляпіла з белымі грыбамі... А ў маразілку, бачу, не лезуць — месца няма. Дык я на балкон іх вынесла, паднос на парэнчы паставіла... Дзверы не паспела зачыніць: сабака следам — і пельмені мае на снег... Цяпер во збіраю.

— Давай сюды міску, а сама ў хату бяжы, — пашкадавалі яе мужчыны, — а то змерзнеш зусім ды, крый бог, захварэеш. Мы самі ўсё падбяром і прынясём.

...Так бы яно і было, відаць, але жонцы Пятровіча не хапіла маянэзу, каб заправіць салату. У краму яна адправіла дачку. А тая, убачыўшы тройку мужчын, захопленых пошукам, тут жа ўляцела ў кватэру і аб'явіла:

— Мама, там наш тата з Андрэем і Косцем поўзаюць ля пад'езда. У дом зайсці не могуць.

— Во! А я ж ведала, што іх паходы дабром не скончацца! Ну зараз выдам! — паабяцала маці, хапаючы качалку і выбягаючы з кватэры...

Што было далей, можна толькі здагадвацца. Добра, што мужчыны былі цвярозыя. І што добрую справу рабілі, хоць і на карачках.

**А. Клемянок,**
*г. Смаргонь.*

## МАЛАДОСЦЬ — УСЁ ДУРНОСЦЬ

...Унучка перад Калядамі стала прыбіраць у хаце, нешта непатрэбнае выкідваць. Гляджу, а там і пусты флакончык ад духоў, і цюбікі памады. Кажу, што некалі рэшткі яе змешвалі ды варылі. Унучка не верыць. Але ж гэта — было.

Гадоў з пяцьдзясят таму вярнуўся з войска мой старэйшы брат Лёнік, і перамены ў ім мы ўбачылі адразу. Да службы на нейкія вечарынкі ён наогул не хадзіў, на дзевак — не глядзеў, а тут раптам ніводных танцаў не прапускае. І полькі выдае такія, што аднойчы аж падэшва адарвалася.

Прыгожы ён быў кавалер: акуратна адзяваўся, не курыў, не выпіваў без важкай нагоды, ведаў шмат анекдотаў... Карацей, ніводзін белы танец ён каля сцяны не стаяў — хінуліся многія дзяўчаты. А сам ён выбраў адну — Алу, сваю былую аднакласніцу, бо яна і праўда за тры гады яго службы ў стройную красуню вырасла, проста «кроў ды малако», прычым малако — не з фермы. Дзеўка, дачка ўчастковага, працавала ў школе піянерважатай і да Лёневых заляцанняў ставілася спачатку досыць паблажліва. Але ж, зноў не паступіўшы на юрфак, змянілася, нават у грыбы з ім стала хадзіць. Ды і бацькі яе, падобна, сказалі, што ну яе з той вучобай. Хлопец не пустадомак, не п'янтос — можна і замуж ісці.

А таму нейкім цудоўным вечарам Ала намякнула Лёніку, што ў іх плануюцца невялічкія дакопкі, і што ён можа смела прыходзіць у сваты.

Пачуўшы гэта, акрылены брат злётаў у другі канец вёскі, дамовіўся з хросным бацькам, дзядзькам Антосем. Сватанне планавалася на суботу, а ў пятніцу Лёня зноў сустракаўся з Алай...

Трэба заўважыць, што касметыкай у вёсцы тады амаль не карысталіся — гэта лічылася прыкметай ледзь не разбэшчанасці, ды і дзе было яе ўзяць — іншым дзяўчатам. А вось у Алы яна была (не ездзіць жа ў горад без макіяжу, не хадзіць жа без яго ў клуб, а тым больш — перад сватанне м).

Карацей, пад вечар той пятніцы яна, помню, прыпынілася каля нашай хаты. Мусіць, хацела, каб мы ўсе пагледзелі, як яна выглядае... І было на што: яркія вусны, чорныя бровы, ружовыя шчокі, блакітныя цені...

Не дзіва, што Лёня з тога спаткання прыйшоў толькі пад раніцу (маці ўжо ўстала карову даіць), адразу ж заснуў і адразу, можна сказаць, прачнуўся. Выпіў сырадою, сказаў, што ў роце пячэ, быццам крапівы нажаваўся. Папрасіў кіслага малака, потым сыроваткі, яблыкаў, але ўсё было марна: Лёня ўвесь час пляваўся.

Мама стала распытваць, што ён піў альбо еў? «Нічога, — сказаў, — толькі... цалаваўся».

Тым часам з'явіўся дзядзька Антось, вялікі аматар халяўнай чаркі, і першае, што параіў, — спаласнуць рот гарэлкай.

Гэта дапамагло, але ненадоўга — пакуль закусвалі. Прыйшлося наліць яшчэ, а потым яшчэ...

Сталі думаць, што рабіць са сватаннем. Сказаць праўду — ніхто не паверыць, бо нявеста (дзядзька Антось міма хаты праходзіў і бачыў) — жывая-здаровая, ёй хоць бы хны. «Значыць, — гэта хросны параіў, — трэба пачакаць: калі Ала і праўда любіць, то прыбяжыць сама, а калі не любіць — дык навошта яна табе трэба?»

Чакалі яны гадзіны са дзве. Марна: ніхто не аказаўся...

Назаўтра, добра адпляваўшыся, Лёнік пайшоў пакаяцца, але ўчастковы яго нават да хаты не падпусціў, бо ўся вёска ўжо гаварыла, што жаніх знайшоў-такі ў дзеўцы загану. Ніхто не ведаў, якую, але ж языкамі пляскалі ўсе.

У выніку дзён праз колькі Ала з'ехала ў райцэнтр, уладкавалася на работу ў пашпартны стол і неўзабаве выйшла замуж за нейкага лейтэнанта.

Не так, як думаў спачатку, склаўся лёс і ў Лёніка. А таму і сваёй унучцы, і ўсім дзяўчатам я казала і кажу, што найлепшая касметыка — гэта маладосць!

**В. Лапцёнак,**
*г. Баранавічы.*

## КОТ І НОВЫ ГОД

...Гэта сёння я ведаю, што «Свіцязянка» — адна з трох балад знакамітага беларуска-польскага паэта Адама Міцкевіча, што яна прысвечана возеру Свіцязь. А ў далёкім 1968-м так называліся звычайныя карамелькі. Тады навошта, спытаеце, пра іх нешта казаць? Ды вось паслухайце.

Ішлі апошнія дзянькі і таго снежня, і таго ўжо вельмі далёкага года. На вуліцы быў добры мароз і сумёты аж да самых стрэх. Пад нашай, у прыватнасці, расло пяцёра дзяцей. На той час старэйшаму брату было шаснаццаць гадоў, малодшаму — восем, а паміж імі — мы, тры сястры адна з-пад адной. Уляцёх 30 снежня мы сходзілі ў школу на ранішнік, атрымалі хай невялікія, але ж падарункі ад Дзеда Мароза. (Дарэчы, папяровыя пакункі для іх мы рабілі самі на ўроках працы. І ўпрыгожвалі, хто як мог.)

У гэты ж дзень мама са старэйшым братам звычайна хадзілі па елку. Лясы ў нас былі прыгожыя, прасторныя. Дрэўцы ўсе — як на малюнках: адно харашэй за другое. Таму і бегалі яны ад елкі да елкі — выбіралі найпрыгажэйшую.

Але ж вось нарэшце наша красуня дома. Раніцай брат абсек ніжнія галінкі і паставіў яе ў вядро з пяском. Абрэзаныя лапкі паклаў у сенцах і каля парога ў зале. Водар стаяў — не надыхацца! Хацелася як найхутчэй павыцягваць ды паразвешваць цацкі. Іх у нас мала было: вялікая «залатая» шышка, гадзіннік і пяць чырвоных шароў, якія наш татачка прывёз з Эстоніі. Словам, месца на галінках заставалася шмат, і яго мы «запаўнялі» камячкамі ваты, прыгожымі сняжынкамі, якія наша мама выразала са школьных сшыткаў, развешвалі саматробныя папяровыя гірлянды-ланцужкі, а ў той год — яшчэ і трыста грамаў цукерак. Яны былі загорнуты ў цёмна-блакітныя паперкі, пасярэдзіне якіх, на залатой палосцы з фольгі, было надпісана «Свіцязянка».

Так-так — вы здагадаліся — цукеркі былі вельмі падобныя на цацкі. На ніточках мы павесілі іх на ёлку, і яна стала проста казачнай! Месячык поўняй свяціў у вокны (яны былі аздоблены кароткімі фіранкамі з накрухмаленай марлі), ёлка зіхацела...

Мы, шчаслівыя, палеглі спаць недзе пасля 12. А гадзіны ў дзве ўжо прачнуліся ад моцнага грукату: наша ёлка, наша прыгажуня... ляжала на падлозе.

Што адбылося, чаму? Дрэнна паставілі?

За справу ўзяліся яшчэ раз і зрабілі ўсё як належыць, аднак праз гадзіну-другую мы зноў прачнуліся ад грукату...

Прычыну падзення ёлкі мы знайшлі ў наступны вечар. Заўважылі, што нашай прыгажуняй любуецца яшчэ і кот. Спачатку — на адлегласці, потым падыходзіць бліжэй, садзіцца, кранае лапкай галінку. Цукеркі, ну вядома ж, пачынаюць рухацца і яшчэ больш блішчэць. Кот скача вышэй, каб зладзіць іх і... Ёлка падае.

Вось такія былі прыгоды са «Свіцязянкай». Злачынца ў іх выніку, вядома ж, не пацярпеў. Цукеркі мы потым з'елі. І пра той Новы год, напэўна, забыліся б, калі б не кот.

**Н. Сіманава,**
*Чэрвеньскі раён.*

**Рубрыку вядзе Валянціна ДОЎНАР.**

| Віцебск — | 9.24 | 16.44 | 7.20 |
| Магілёў — | 9.18 | 16.51 | 7.33 |
| Гомель — | 9.06 | 16.56 | 7.50 |
| Гродна — | 9.41 | 17.18 | 7.37 |
| Брэст — | 9.34 | 17.27 | 7.53 |

### Месяц

*Апошняя квадра 29 снежня.*
*Месяц у сузор'і Казярога.*

### Імяніны

**Пр.** *Дзмітрыя, Настассі, Фёдара*
**К.** *Ангелікі, Анелі, Рыгора, Яўгена.*




Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

## ЗАЎТРА




## Даты | Падзеі | Людзі

### 4 СТУДЗЕНЯ




**859** год — з'явіліся першыя летапісныя звесткі пра племянны саюз крывічоў, групу ўсходніх славян, якія займалі тэрыторыю верхняга цячэння Дняпра, Заходняй Дзвіны, Волгі, паўднёвай часткі басейна Чудскога возера. На думку некаторых вучоных, назва «крывічы» азначае «блізкія па паходжанні» («па крыві»), іншыя даследчыкі спасылаюцца на імёны родапачынальніка Крыва або язычаскага першасвяшчэнніка Крыву-Крывейту.

**1264** год — пачалося княжанне ў Вялікім Княстве Літоўскім Войшалка (сын Міндоўга), які аб'яднаў Навагрудскую, Пінскую, Полацкую і Віцебскую землі (у 1267 пакінуў княжацкі пасад і сышоў у заснаваны ім Лаўрышаўскі манастыр).

**1729** год — нарадзіўся (вёска Ясянец, сёння ў Баранавіцкім раёне) Іаахім Храптовіч, грамадска-палітычны і дзяржаўны дзеяч ВКЛ, філасоф, публіцыст, паэт і перакладчык. З 1765 года — маршалак галоўнага трыбунала ВКЛ, з 1773-га — падканцлер літоўскі, адзін з арганізатараў і членаў Адукацыйнай камісіі. Кіраўнік каралеўскай групоўкі магнатаў і шляхты ў Вялікім Княстве Літоўскім з 1780 года, міністр замежных спраў — з 1791-га, канцлер ВКЛ — з 1793 года. У сваіх маёнтках у Шчорсах і Вішневе замяніў паншчыну чыншам, пабудаваў у Шчорсах палац, школу, уніяцкую царкву, арганізаваў бібліятэку з багатым архівам старажытных дакументаў. Памёр у 1812 годзе.

**1869** год — нарадзіўся (вёска Добасна, цяпер у Кіраўскім раёне) Ядвігін Ш. (сапр. Антон Іванавіч Лявіцкі), беларускі пісьменнік, публіцыст, фельетаніст, адзін з пачынальнікаў новай беларускай прозы. Аўтар зборнікаў апавяданняў «Бярозка», «Васількі», паэмы «Дзед Завала», кнігі «Успаміны», няскончанага рамана «Золата». Памёр у 1922 годзе.



**1908** год — прынята ў эксплуатацыю першая міжгародняя тэлефонная лінія Мінск — Барысаў.

**1959** год — нарадзіўся (вёска Бадзені, Мядзельскі раён) Мікола Шабовіч, беларускі паэт, перакладчык, філолаг і педагог. Член Саюза пісьменнікаў Беларусі. Кандыдат філалагічных навук. Аўтар некалькіх паэтычных зборнікаў. Паэзія Міколы Шабовіча — лірычна-філасофская. Яна акумулюе як трагедыйнасць нашага часу, так і імгненні шчасця, радасць жыць і тварыць на роднай зямлі. Галоўная ў яго творчасці тэма — тэма кахання, светлага пачуцця да Жанчыны. Акрамя таго, паэт напісаў шмат прачулых вершаваных твораў пра родны Мядзельскі край, яскравыя літаратурныя пародыі, эпіграмы і прысвячэнні сваім калегам па пяры, гумарыстычныя вершы. На вершы Міколы Шабовіча напісана больш як 180 песень.




**1643** год — нарадзіўся (1643—1727) Ісаак Ньютан, англійскі фізік і матэматык, які стварыў тэарэтычныя асновы класічнай механікі і астраноміі, адкрыў закон сусветнага прыцягнення. Памёр у 1727 годзе.

**1930** год — была апублікаваная кніга К. Э. Цыялкоўскага «Рэактыўны аэраплан», у якой вучоны абгрунтаваў прымяненне ракетных рухавікоў у авіяцыі: «За эрай аэрапланаў вінтавых павінна прыйсці эра аэрапланаў рэактыўных».

## УСМІХНЕМСЯ

**Муж на Новы год падарыў абанемент у масажны салон. Пацеха ў тым, што масажыст там таксама ён.**

Першага студзеня.
— Добрай раніцы!
— На сябе паглядзі!

**Пад ёлкай раніцай 1 студзеня ляжыць усё самае добрае — падарункі, сябры.**

Трэцяга студзеня чалавек на 80 % складаецца з маянэзу.

**У краме.**
**— А ў вас ёсць нейкія навагоднія зніжкі?**
**— Так, вось гэтыя тавары не падаражэлі.**





ЗВЯЗДА БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ НУМАР 2 АД 17 ЛЮТАГА 2009 ГОДА, ВЫДАДЗЕНАЕ МІНІСТЭРСТВАМ ІНФАРМАЦЫІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ.

Дырэктар — галоўны рэдактар СУХАРУКАЎ Павел Якаўлевіч.

РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ: В. АНУФРЫЕВА (намеснік галоўнага рэдактара), Н. ДРЫНДРОЖЫК, Н. КАРПЕНКА (першы намеснік галоўнага рэдактара), А. ЛЯЎКОВІЧ (першы намеснік дырэктара), М. ЛІТВІНАЎ (намеснік галоўнага рэдактара), А. КЛЯШЧУК, Н. РАСОЛЬКА, С. РАСОЛЬКА, А. СЛАНЕЎСКІ (намеснік галоўнага рэдактара), В. ЦЕЛЯШУК.

Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».

НАШ АДРАС: 220013 г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.

ТЭЛЕФОНЫ Ў МІНСКУ: прыёмнай – 287 19 19 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 287 18 64, маркетынгу — 337 44 04, бухгалтэрыі: 287 18 81.

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Передрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

http://www.zviazda.by;
e-mail: info@zviazda.by,
(для зваротаў): zvarot@zviazda.by

ПРЫЁМ РЭКЛАМЫ тэл./факс: 287 17 79, e-mail: reklama@zviazda.by

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 02330/106 ад 30.04.2004. 220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Выходзіць 5 разоў на тыдзень.

Тыраж 20.008. Індэкс 63850. Зак. № 132.

М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12

Нумар падпісаны ў 19.30 3 студзеня 2019 года.

# МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ

4 студзеня 2019 г. № 1 (486)

Штотыднёвы дадатак газеты ЗВЯЗДА

ГАЗЕТА ДЛЯ ВЫБАРШЧЫКАЎ І ДЭПУТАТАЎ МЯСЦОВЫХ САВЕТАЎ


ТЭМА ТЫДНЯ

# ПЛЯЦОЎКА ДЛЯ ІНІЦЫЯТЫЎНЫХ

## У Гродне дэпутаты абяцаюць падтрымаць маладых парламентарыяў




Фота БелТА.

Вучань гімназіі № 5 Гродна Натан ШАМСУТДЗІНАЎ і вучаніца ліцэя № 1 Таццяна ЖУКАВЕЦ.

**Маладзёжны парламент пры Гродзенскім абласным Савеце дэпутатаў правёў першую сесію чацвёртага склікання, на якой былі агучаны новыя праекты і абраны лідар.**

Маладыя дэпутаты сабраліся ў зале пасяджэнняў у аблвыканкаме. Менавіта тут праходзяць усе важныя сходы, у тым ліку сесіі абласнога Савета дэпутатаў. Урачыстасці надала і прысутнасць гасцей — членаў Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу па адукацыі, культуры і навуцы, якую ўзначальвае Ігар Марзалюк. Ён упэўнены, што маладзёжны парламент здольны арганізаваць вакол сябе многіх для добрых спраў. Бо дзіцячыя абраннікі па-даросламу прайшлі некалькі тураў выбараў, маюць свае праграмы, а галоўнае — грамадзянскую пазіцыю.

стар. 4–13

ЗАНЯТАСЦЬ

# Дзе складана знайсці работу?

## Урад вызначыў тэрыторыі з напружанай сітуацыяй на рынку працы

**У 2019 годзе ў гэты спіс трапілі 53 раёны — амаль 45 працэнтаў ад усіх рэгіёнаў. Такая інфармацыя змяшчаецца ў пастанове Савета Міністраў ад 27 снежня 2018 года № 950.**

Больш за ўсё праблемных тэрыторый у Віцебскай і Мінскай абласцях — па 15. На Віцебшчыне ў іх лік трапілі Бешанковіцкі, Браслаўскі, Верхнядзвінскі, Глыбоцкі, Гарадоцкі, Докшыцкі, Лепельскі, Лёзненскі, Мёрскі, Аршанскі, Пастаўскі, Сенненскі, Талачынскі, Чашніцкі і Шаркаўшчынскі раёны. На Міншчыне складанасці з пошукам работы прагназуюцца ў Барысаўскім, Вілейскім, Валожынскім, Клецкім, Капыльскім, Крупскім, Любанскім, Маладзечанскім, Нясвіжскім, Пухавіцкім, Слуцкім, Салігорскім, Стаўбцоўскім, Уздзенскім і Чэрвеньскім раёнах.

У Брэсцкай вобласці напружаная сітуацыя з працаўладкаваннем у наступных раёнах: Баранавіцкі, Ганцавіцкі, Драгічынскі, Іванаўскі, Івацэвіцкі, Кобрынскі, Лунінецкі і Маларыцкі. На Гомельшчыне асаблівая ўвага будзе аддадзена Жлобінскаму, Лельчыцкаму, Лоеўскаму, Акцябрскаму, Светлагорскаму і Хойніцкаму раёнам. На Магілёўшчыне праблемнымі прызналі Бялыніцкі, Клічаўскі, Касцюковіцкі, Мсціслаўскі, Чавускі, Чэрыкаўскі раёны і горад Бабруйск.

З Гродзенскай вобласці ў спіс трапілі толькі два раёны — Лідскі і Свіслацкі.

Дарэчы, летась тэрыторый з напружанай сітуацыяй на рынку працы было менш — 48 раёнаў. Як і цяпер, большасць з іх знаходзіліся ў Віцебскай вобласці. Спіс такіх рэгіёнаў вызначаюць па шасці крытэрыях. Гэта ўзровень зарэгістраванага беспрацоўя, доля беспрацоўных, якія шукаюць работу 12 месяцаў і больш, доля работнікаў арганізацый, якія працуюць у рэжыме вымушанай няпоўнай занятасці, доля работнікаў арганізацый, якія знаходзіліся ў цэлaдзённым ці цэлазменным прастоі, каэфіцыент напружанасці на рынку працы і каэфіцыент замяшчэння рабочай сілы (адносіны колькасці прынятых работнікаў да колькасці звольненых).

**Наталля ЛУБНЕЎСКАЯ.**

## СЁННЯ Ў НУМАРЫ

### «Хачу бабуліну пенсію»



**Якія пытанні прагучалі на суботняй прамой лініі з кіраўніком дэпутацкага корпуса Міншчыны.** стар. 2

### Узяць крэдыт на сябе



**Сенатар прапануе працэнты за жыллёвы крэдыт работнікаў «гасіць» прадпрыемству.** стар. 3

### «Космас-корт» і школа



**Якія праекты будуць рэалізоўвацца ў Магілёве сёлета?** стар. 3

### Застацца ў глыбінцы



**Зусім нядрэнна. Маладыя спецыялісты Брэстчыны ведаюць усе перавагі.** стар. 14

### Новыя дом і радзільня



**У Лельчыцах напярэдадні Новага года адбыліся значныя наваселлі.** стар. 16

# Што зроблена?

**На Гомельшчыне сёлета знесены 2,5 тысячы пакінутых дамоў. Аб гэтым паведаміла старшыня аблсавета Кацярына Зенкевіч на сесіі Гомельскага абласнога Савета дэпутатаў.**

Яна адзначыла, што праца са старымі і пустуючымі дамамі з'яўляецца важным элементам добраўпарадкавання населеных пунктаў.

— У 2018 годзе ў Гомельскай вобласці знесены 2501 такі аб'ект. Пры гэтым сярэдні кошт зносу аднаго домаўладання з добраўпарадкаваннем тэрыторыі склаў 1,5 тысячы рублёў, — прыводзіць яе словы БелТА.

У Год малой радзімы добраўпарадкаванню, паляпшэнню санітарнага стану населеных пунктаў і тэрыторый аддадуць асаблівая ўвага.

— Жыхары і госці вобласці пераканаліся, што практыка комплекснага добраўпарадкавання, калі на гэта накіроўваюцца ўсе сілы і сродкі, цалкам апраўданая, — упэўненая Кацярына Зенкевіч.

Шэраг мерапрыемстваў па навядзенні парадку прайшлі і па ініцыятыве дэпутатаў аблсавета. Старшыня аблсавета таксама адзначыла, што ва ўладкаванні свайго роднага краю прымаюць актыўны ўдзел і жыхары рэгіёна. Так, на працягу года ў вобласці прайшлі 1,5 тысячы суботнікаў, добраўпарадкаваны месцы масавага адпачынку, паркі, скверы, помнікі, дзіцячыя пляцоўкі і гэтак далей.

Акрамя таго, Кацярына Зенкевіч лічыць важным узаемадзеянне дэпутатаў розных узроўняў і тэрыторый і кіраўнікоў, спецыялістаў службаў, арганізацый, ведамстваў.

— Гэта дапамагае выявіць новыя рэзервы для павышэння эфектыўнасці дзейнасці, — дадала яна. У якасці прыкладу была прыведзена работа па напаўненні адзінага пераліку аб'ектаў, дзе неабходна прыняць меры па навядзенні парадку. Для вызначэння кропкавага месцазнаходжання аб'екта выкарыстоўваюцца сучасныя картаграфічныя матэрыялы. Электронная версія адзінага пераліку дазваляе спецыялістам розных структур апарату апрацоўваць і падтрымліваць у актуальным стане інфармацыю.

Выкананню задач, якія стаяць перад саветамі, спрыяе і работа органаў тэрытарыяльнага грамадскага самакіравання. У Гомельскай вобласці дзейнічаюць 676 калегіяльных і 3309 аднаасобных ОТГСаў. Кацярына Зенкевіч звярнула ўвагу старшынь райсаветаў дэпутатаў, што падобныя органы павінны паўсюдна быць створаны і эфектыўна працаваць, тым больш што ў рэгіёне ёсць вопыт у гэтым кірунку.

Таксама старшыня аблсавета адзначыла, што ў гэтым годзе дэпутаты правялі 600 прыёмаў грамадзян, разгледзелі каля дзвюх тысяч зваротаў.

— Колькасць зваротаў можа быць ніжэйшай, калі дэпутаты будуць больш актыўна працаваць з грамадзянамі менавіта на месцах. Формы зносін ёсць розныя: гэта і ўдзел у днях сельсавета, днях дэпутата, сходах, выязных сумесных прыёмах, сустрэчах з працоўнымі калектывамі і гэтак далей, — растлумачыла Кацярына Зенкевіч.

Важнасць работы народных абраннікаў на месцах падкрэсліў і старшыня Гомельскага аблвыканкама Уладзімір Дворнік. Дэпутат працуе непасрэдна з людзьмі, ведае іх настрої, пераканаыі ён.

На сесіі дэпутаты падвялі вынікі працы ў гэтым годзе і вызначылі перспектыўныя напрамкі на наступны.

# «КОСМАС-КОРТ» І ШКОЛА

**Дэпутаты Магілёўскага гарсавета зацвердзілі асноўныя паказчыкі прагнозу сацыяльна-эканамічнага развіцця і прынялі бюджэт Магілёва на 2019 год.**

Як агучвалася на сесіі, вялікіх паступленняў у гарадскі бюджэт не чакаецца, таму трэба па максімуме знізіць затраты, каб захаваць тую стабільнасць, якую атрымалася дасягнуць у мінулым годзе. Зыходзячы з прагназуемага даходу ў суме 363,8 мільёна рублёў, расходная частка бюджэту Магілёва на 2019 год зацверджана ў суме 362,7 мільёна рублёў. Асноўныя сродкі — прыкладна 85 % бюджэту традыцыйна пойдуць на ахову здароўя, адукацыю, жыллёва-камунальную гаспадарку.

З абласнога бюджэту прадугледжана фінансаванне будаўніцтва важнага для горада аб'екта — новай школы ў адным з маладых мікрараёнаў Казіміраўцы. Не менш важны аб'ект для Магілёва — вяслярная база, на завяршэнне будаўніцтва якой доўгі час не хапала грошай. Прынятае рашэнне перапрафіляваць гэты аб'ект пад шматфункцыянальны фізкультурна-аздараўленчы комплекс з будаўніцтвам басейна, памяшканняў для заняткаў спортам, фітнесам, цяжкай атлетыкай. Таксама прадугледжана фінансаванне шэрагу іншых спартыўных аб'ектаў. Напрыклад, планурецца завяршыць рэканструкцыю тэніснага «Космас-корта».

Усяго на апошняй у мінулым годзе сесіі Магілёўскага гарсавета было разгледжана 24 пытанні.

**Нэлі ЗІГУЛЯ.**

# ФРАНЦУЗСКІЯ ПАРЛАМЕНТАРЫІ ПРЫЕДУЦЬ У БЕЛАРУСЬ



**Парламенцкая дэлегацыя Францыі на чале з кіраўніком групы дружбы «Францыя — Беларусь» Сената Францыі Шарлем Генэ сёлета наведае з візітам Мінск.**

Як паведамляе прэс-служба Савета Рэспублікі, візіт адбудзецца па запрашэнні беларускага боку і будзе садзейнічаць рэалізацыі дамоўленасцяў, дасягнутых падчас сустрэчы спікера верхняй палаты беларускага парламента Міхаіла Мясніковіча з прэзідэнтам Сената Францыі Жэрарам Ларшэ ў лістападзе мінулага года.

У рамках візіту французскіх парламентарыяў у Беларусь плануецца абмеркаваць шырокі спектр пытанняў двухбаковага супрацоўніцтва. Асаблівая ўвага будзе аддадзена ўмацаванню міжпарламенцкага ўзаемадзеяння і ролі парламенцкага вымярэння ў пашырэнні гандлёва-эканамічных сувязяў і інвестыцыйнага партнёрства паміж краінамі.

Адзначым, што ў 2018 годзе ўпершыню ў гісторыі беларуска-французскіх адносін былі створаны рабочая група па супрацоўніцтве з Францыяй у Савеце Рэспублікі і група дружбы «Францыя — Беларусь» у Сенаце Францыі.

Дзейнасць гэтых груп накіравана на пашырэнне супрацоўніцтва пабрацімскіх гарадоў Беларусі і Францыі, усталяванне прамых кантактаў паміж дзелавымі коламі, развіццё двухбаковых адносін у інвестыцыйнай, сельскагаспадарчай, экалагічнай і іншых сферах.

БЛІЗКАЯ ЎЛАДА

# НА АПЕРАДЖЭННЕ СІТУАЦЫІ

**Старшыня Мінскага абласнога Савета дэпутатаў Наталля ЯКУБІЦКАЯ ў рабоце са зваротамі грамадзян дэманструе свой адметны почырк. Не стала выключэннем і чарговая прамая тэлефонная лінія, якая прайшла днямі.**


Фота Ганны ЗАНКАВІЧ.

— Пытанні, якія мне задаюць, стараюся вырашаць адразу: тэлефаную кіраўнікам раёнаў, структурных падраздзяленняў вобласці, старшыням раённых Саветаў дэпутатаў. Я пазбягаю адкладваць нейкую праблему на потым, — расказала Наталля Віктараўна. — А пытанні паступаюць самыя розныя: па добраўпарадкаванні, навядзенні парадку на зямлі, дарогах, могілках. І мы стараемся працаваць на апераджэнне. Такія задачы стаўлю і перад старшынямі райсаветаў.

Дастаткова шмат пытанняў па рабоце спажывецкай кааперацыі. У прынцыпе мы і на сесіі разгледзелі і павялічылі пералік тэрыторый сельскіх населеных пунктаў, якія падпадаюць пад дзеянне Указа Прэзідэнта і маюць прэферэнцыі па гандлёвым абслугоўванні на сяле. Лічу, што гэты дакумент дапамагае выходзіць з сітуацыі. Летась надта актыўна дэпутаты, старшыні раённых Саветаў дэпутатаў займаліся рэалізацыяй Дэкрэта № 1 «Аб садзейнічанні працоўнай занятасці насельніцтва». З гэтай мэтай створылі ў раёнах і горадзе Жодзіне 23 камісіі. Яны працуюць эфектыўна і накіраваны ў першую чаргу на тое, каб забяспечыць людзей рабочымі месцамі. Акрамя таго, у раёны паступілі базы працаздольных не занятых у эканоміцы, і мы карпатліва перапраўляем спісы, каб сюды не трапілі выпадковыя людзі. Зразумела чаму: у далейшым грамадзяне працаздольныя, але не занятыя ў эканоміцы, будуць плаціць 100 % тарыф на гарачую ваду.

Чарговая тэлефонная лінія таксама была напружанай. Нягледзячы на святочныя клопаты, сюды звярнулася каля дваццаці чалавек. Не толькі з Мінскай вобласці, але і са сталіцы, якія маюць у цэнтральным рэгіёне дачы, зямельныя ўчасткі, домікі.

Ала Іванаўна з аграгарадка Касаўка Бярэзінскага раёна даглядала адзінокую 95-гадовую суседку. Жанчына не дажыла два дні да атрымання чарговай пенсіі. Ала Іванаўна хацела б атрымаць гэтыя грошы, але не дазваляе заканадаўства. Звярталася яна і да старшыні Капланецкага сельвыканкама, але і тая не дапамагла, за што заяўніца ў вялікай крыўдзе на кіраўніка. Маўляў, я пахавала бабулю як належыць і засталася ў даўгах, хто мне кампенсуе затраты? у

— Разбяромся, — рэзюмавала Наталля Віктараўна, уважліва выслухаўшы скаргу, і звязалася са старшынёй сельскага Савета дэпутатаў Любоўю Забаронак.

— Як я зразумела са слоў Алы Іванаўны, нібыта сельвыканкам устараніўся ад пахавання пенсіянеркі, не аказаў дапамогу? — запыталася Наталля Якубіцкая ў падначаленай.

— Бабулі прапаноўвалі паслугі сацыяльнага работніка, яна адмовілася. Так, суседка даглядала яе. Але ж пенсія памерлай ішла ў агульны бюджэт: у доме зрабілі рамонт, паставілі шклопакеты. Бабуля афарміла дароўную на свой дом на гэтую жанчыну. Цяпер яна хоча яго прадаць. А тое, што прыняла ўдзел у пахаванні, то яна атрымала грошы ад дзяржавы. Што датычыцца пенсіі, то Ала Іванаўна не мае права на яе атрыманне.

— Мне зразумелая сітуацыя. Вам трэба дзейнічаць у межах заканадаўства, — падсумавала Наталля Якубіцкая.

Вольга Яўгенаўна купіла зямельны ўчастак у Чэрвеньскім раёне на аўкцыёне. Але не можа пачаць будаўніцтва, паколькі няма электрычнасці. «Дапамажыце, парайце, куды звярнуцца», — прасіла жанчына.

Старшыня абласнога Савета дэпутатаў пацікавілася, дзе знаходзіцца ўчастак: у населеным пункце або ў раёне індывідуальнай забудовы, якая адлегласць да найбліжэйшага трансфарматара, ці ёсць магчымасць да яго падключыцца. «Будзем разбірацца з сітуацыяй. Мяркую, пры вашым дольным удзеле пытанне вырашыцца».

Уладзімір Міхайлавіч — пенсіянер, аддаў дзецям гарадскую кватэру, а сам пасяліўся ў бацькоўскім доме ў Пухавіцкім раёне. Побач з вёскай знаходзіцца некалькі дачных масіваў. І на зіму гаспадары перабіраюцца ў Мінск, а хатніх жывёл кідаюць на волю лёсу. Мужчына шкадуе няшчасных валацуг, корміць іх, у яго жывуць дванаццаць катоў, сабака. Панадзіўся да яго хадзіць чужы цюцька, разумее, што тут не пакінуць яго галодным. Аднойчы пенсіянер не вытрымаў і пайшоў пасарамаціць мінчаніна, калі той завітаў на лецішча. Але замест размовы атрымаў кухталёў. Мужчына напісаў заяву ў міліцыю, быў суд, які выпісаў забіяку штраф у 500 рублёў. Ды заяўнік незадаволены і хоча, каб на яго крыўдзіцеля завялі крымінальную справу. «Для таго каб прыцягнуць яго да крымінальнай адказнасці, вам неабходна было зняць пабоі, — растлумачыла Наталля Якубіцкая. — Ды і наогул я не маю права ўплываць на рашэнне суда. Мужчыну пакаралі рублём. І думаю, для яго гэта будзе ўрокам. Цяпер, перш чым распускаць рукі, ён падумае».

Але гэтым разам былі не толькі «праблемныя» званкі. Людзі віншавалі старшыню абласнога Савета са святамі, дзякавалі за дапамогу, уменне прафесійна вырашаць пытанні. А адзін мужчына, які не пажадаў назваць сябе, выказаў Наталлі Якубіцкай падзяку за ўмелае кіраўніцтва дэпутацкім корпусам, за тое, што адстойвае інтарэсы жыхароў вобласці. «У вас прагматычны почырк, ваша пазіцыя на баку простых людзей. Хочам пажадаць, каб вашы планы і задумы збываліся», — сказаў ён.

**Таццяна ЛАЗОЎСКАЯ.**

РАЗГЛЕДЖАНА НА СЕСІІ

# Лакаматыў для эканомікі і бонусы для работнікаў

**У канцы мінулага года дэпутаты гарадскога Савета разам з кіраўніцтвам выканкама абмяркоўвалі і прымалі бюджэт абласнога цэнтра на 2019 год. Гэта галоўны дакумент, які зацвярджаецца на сесіі і прадугледжвае фінансаванне па ўсіх кірунках. Як і раней, асноўныя сродкі будуць выдаткаваны на сацыяльную сферу. Разам з тым не ўсе атрымаюць па сваіх патрэбах. Для гэтага неабходна «падцягваць» эканоміку горада, ствараць новыя рабочыя месцы і заахвочваць работнікаў. Выканаўчыя ўлады і дэпутаты збіраюцца знайсці такі лакаматыў, які будзе ўдала працаваць у сучасных умовах.**

## ШТО Ў ПРЫЯРЫТЭЦЕ?

Як заўсёды, бюджэт сацыяльна накіраваны. Крыху больш за палову — 52 % — пойдзе на адукацыю, ахову здароўя, культуру, спорт, турызм.

— Хацелася больш увагі звярнуць на ахову здароўя, бо сродкаў для галіны не хапае, — адзначыў **старшыня Гродзенскага гарвыканкама Мечыслаў ГОЙ.** — У сувязі з гэтым было прынята рашэнне аб выдзяленні дадатковых фінансавых сродкаў. У першую чаргу за кошт гэтага будзе набыта абсталяванне для паліклінік і бальніц. Многія маюць у гэтым значную патрэбу.

Таксама сродкі пойдуць на будаўніцтва новых аб'ектаў аховы здароўя. У мікрараёне Альшанка «запусцяць» яшчэ адну амбулаторыю і купяць абсталяванне. Пачнуцца работы па праектаванні другой па ліку паліклінікі. Новы мікрараён пакуль востра адчувае недахоп сацыяльнай інфраструктуры.

Усяго на ахову здароўя горада будзе выдаткавана 95 мільёнаў рублёў. А самыя значныя сродкі пойдуць на адукацыю — 150 мільёнаў рублёў. Гэта асноўныя сферы бюджэтнага фінансавання. Дарэчы, на 2019 год расходы па ім павялічацца на 13 і 20 мільёнаў рублёў адпаведна.

## СПРОБА КААПЕРАЦЫІ

Бюджэт фарміруецца з некалькіх крыніц. Асноўны прыбытак — 47 % — дае падаходны падатак грамадзян. Яны плацяць 13 % сваёй заработнай платы. Адчувальную частку бюджэту фарміруе таксама падатак на прыбытак з юрыдычных асоб. Яшчэ адна важная крыніца даходнага артыкула — падатак на зямлю і нерухомасць.

— У 2018 годзе шэрагу прадпрыемстваў мы знізілі гэты паказчык, некаторым — з паніжальным каэфіцыентам, што дасць ім магчымасць далей развівацца, — падкрэсліў **старшыня гарадскога Савета дэпутатаў Барыс ФЁДАРАЎ.**

У даходную скарбонку паступаюць адлічэнні ад продажу дзяржаўнай маёмасці і зямельных участкаў. Летась за кошт гэтага атрымалася значна папоўніць бюджэт, бо назіраўся добры попыт на зямельныя ўчасткі.

— Атрыманыя ад іх продажу сродкі накіроўваюцца на стварэнне інфраструктуры ў раёнах індывідуальнай забудовы, — паведаміў Барыс Фёдараў. — Напрыклад, у 2018 годзе добраўпарадкавана шэсць вуліц у індывідуальным сектары. На 2019 год плануем з гэтых жа крыніц і дадатковых бюджэтных сродкаў увесці яшчэ як мінімум дванаццаць вуліц. Думаю, што атрымаецца зрабіць і больш. Будзем падключаць і грамадзян, каб людзі ўдзельнічалі ў будаўніцтве дарог з выкарыстаннем сваіх сродкаў. І такія прыклады ўжо ёсць.

З гэтага вынікае, што жыхары вуліц кааперуюцца з дзяржаўнымі органамі, каб вырашыць праблему добраўпарадкавання. Вопыт паказаў, што грамадзяне больш беражліва ставяцца да тых аб'ектаў, якія зроблены ў тым ліку і за іх грошы.

## ЗНАЙСЦІ ФЛАГМАН

Вынікі года паказалі, што горад добра спрацаваў па экспарце тавараў і паслуг. Многія прадпрыемствы трымаюць «нос па ветры» і шукаюць рынкі збыту дзе гэта толькі магчыма. Напрыклад, прадпрыемства «Малочны свет» адпраўляе прадукцыю ў Іарданію, знаходзяцца заказчыкі гродзенскіх тавараў у Катары і іншых далёкіх краінах. Гэта першыя крокі ў дыверсіфікацыі рынку, які будзе значна перакройвацца. Так, згодна з рэспубліканскай праграмай, беларускія прадпрыемствы павінны зменшыць экспарт тавараў у Расію да 30 % (зараз у гродзенцаў ён складае да 80 %).

Яшчэ на 30 % трэба забяспечыць экспарт у ЕС і на 30 % — у іншыя дальнія краіны. Да такіх суадносін трэба імкнуцца і прадпрыемствам горада. Акцэнт у гэтым кіраўніцтва абласнога цэнтра робіць на развіцці СЭЗ. Работа прадпрыемстваў свабоднай эканамічнай зоны можа забяспечыць і паступленне прамых замежных інвестыцый. А гэта праблемнае для горада пытанне.

— Зыходзячы з вопыту работы 2018 года, экспарт паслуг і тавараў можна спрагназаваць. Мы выйшлі на новыя рынкі збыту, новыя віды прадукцыі — з гэтым не будзе праблем, — упэўнены кіраўнік гарвыканкама. — Цяжэй з прамымі замежнымі інвестыцыямі. На працягу апошніх двух гадоў мы не змаглі знайсці буйнога інвестара, які пацягне за сабой іншыя кірункі. Напрыклад, у Смаргоні такім прадпрыемствам стаў завод «Кранаспан» і група кампаній «Садружнасць», якія стварылі кластар і вядуць за сабой іншыя вытворчасці.

Старшыня гарвыканкама спадзяецца, што такі флагман сёлета будзе знойдзены і праект пачне рэалізавацца.

## БОНУСЫ ДЛЯ РАБОТНІКАЎ

Дэпутаты звярнулі ўвагу на праблему кадраў. Не сакрэт, што многія спецыялісты едуць на заробкі ў іншыя краіны, у тым ліку — у суседнюю Польшчу. Асабліва гэта датычыцца будаўнічай галіны. Таму запланавана павелічэнне сярэдняй заработнай платы са 102 да 112 працэнтаў. Такі рост дазволіць затрымаць працоўныя рэсурсы, палепшыць бюджэт сем'яў. А галоўнае — не шукаць лепшай долі за мяжой, а працаваць у сваім горадзе і добра зарабляць. Такую задачу, па словах Мечыслава Гоя, ставіць перад сабой гарадскія ўлады на 2019 год.

— Ёсць добрая дынаміка за апошнія два месяцы. І мы зараз павінны ўтрымліваць планку ў тысячу рублёў. Мяркую, што сярэдняя зарплата будзе ў памеры 1100 рублёў на 2019 год, — падкрэсліў кіраўнік горада.

Даволі радыкальны бонус для работнікаў вынес на абмеркаванне **член Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу, генеральны дырэктар Гродзенскага мясакамбіната Анатоль ГРЫШУК.** Ён прапанаваў даць магчымасць прадпрыемствам пагашаць працэнты за жыллёвы крэдыт сваіх работнікаў. Што і казаць, меры даволі смелыя і не кожнае прадпрыемства можа сабе гэта дазволіць. Таму ініцыятыва будзе разглядацца пазней і прынята як рэкамендацыя. Разам з тым Анатоль Грышук упэўнены, што такая мера — адна з самых дзейсных па замацаванні работніка на вытворчасці.

На сесіі прагучаў зварот да дэпутатаў-кіраўнікоў аб удзеле на прынцыпах кааперацыі ў будаўніцтве арэндных кватэр. Увогуле, будаўніцтва жылля будзе актывізавана. У першую чаргу кватэры атрымаюць шматдзетныя і тыя, хто мае патрэбу, а такіх у горадзе больш за 1200 чалавек.

**Маргарыта УШКЕВІЧ.**



# Самазанятыя атрымалі права рабіць страхавыя ўнёскі ў ФСАН

**Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка на мінулым тыдні падпісаў Указ № 500 «Аб дзяржаўным сацыяльным страхаванні».**

Аб гэтым паведамляе БелТА са спасылкай на прэс-службу беларускага лідара. Дакументам дадзена права самазанятым фізічным асобам, якія ажыццяўляюць непрадпрымальніцкую дзейнасць, удзельнічаць у дзяржаўным сацыяльным страхаванні. Змяняецца таксама парадак выплаты ўзносаў у дзяржаўны пазабюджэтны фонд сацыяльнай абароны насельніцтва для індывідуальных прадпрымальнікаў, натарыусаў і адвакатаў.

Зараз унёскі будуць выплачвацца імі толькі за перыяд фактычнага ажыццяўлення сваёй дзейнасці з атрыманнем даходу. Указ рэгулюе таксама пытанні забеспячэння правоў і гарантый у галіне дзяржаўнага сацыяльнага страхавання асоб, якія працуюць у замежных арганізацыях на тэрыторыі Беларусі, і грамадзян, якія апраўданыя судом і крымінальны пераслед супраць якіх спынены. Акрамя таго, дакументам скарэктаваны асобныя нормы заканадаўчых актаў з улікам правапрымяняльнай практыкі, а таксама ў мэтах прывядзення іх у адпаведнасць са зменамі ў заканадаўстве.

# Дапамога ў працаўладкаванні

**На Гомельшчыне камісіі па каардынацыі работы па садзейнічанні занятасці насельніцтва накіравалі на працаўладкаванне больш за 200 чалавек.**

Аб гэтым БелТА паведаміў **першы намеснік старшыні камітэта па працы, занятасці і сацыяльнай абароне Гомельскага аблвыканкама Аляксандр СЕМІЁНАЎ.** Паводле яго слоў, у вобласці функцыянуюць 25 пастаянна дзеючых камісій па садзейнічанні занятасці насельніцтва: 21 — пры раённых выканкамах, чатыры — пры адміністрацыях раёнаў Гомеля.

— За час работы камісій з чэрвеня 2018 года былі накіраваны на працаўладкаванне звыш 200 чалавек. Напрыклад, у Хойніцкім раёне — 40 жыхароў, у Добрушскім — 27, у Нараўлянскім — 20, у Кармянскім — 16, — удакладніў суразмоўнік.

Усяго ж па дапамогу, у тым ліку прававую, кансультацыйную, метадычную, у камісіі летась звярнулася больш за 600 жыхароў рэгіёна. Тэматыка паднятых грамадзянамі пытанняў была разнастайнай.

— Многія цікавіліся дзеючым заканадаўствам, іншыя — алгарытмам уключэння ў базу не занятых у эканоміцы грамадзян, праслі растлумачыць і аспекты, якія датычацца аплаты паслуг ЖКГ, — адзначыў першы намеснік старшыні камітэта.

Людзі, якія звярнуліся ў камісіі, вывучаюць і банк вакансій. Дарэчы, у рэгіянальным банку налічваецца каля 10,5 тысячы прапаноў.

— Запатрабаваныя кіроўцы аўтамабіля, рознага роду спецыялісты ў будаўнічай галіне (муляры, бетоншчыкі, электрагазазваршчыкі), сельскагаспадарчай (аператары машыннага даення, жывёлаводы, трактарысты-машыністы сельскагаспадарчай вытворчасці), у сферы паслуг (швачкі) і гандлі (прадаўцы), таксама ёсць патрэба ў кваліфікаваных спецыялістах медыцынскай галіны, — расказаў Аляксандр Семіёнаў.

Ён звярнуў увагу, што пры неабходнасці беспрацоўныя могуць прайсці прафесійнае навучанне і павышэнне кваліфікацыі па накіраванні органаў па працы, занятасці і сацыяльнай абароне. Так, у 2018 годзе новымі для сябе і запатрабаванымі на рынку працы прафесіямі авалодала больш за 1,3 тысячы жыхароў рэгіёна.


**РУП «ИНСТИТУТ НЕДВИЖИМОСТИ И ОЦЕНКИ» ИЗВЕЩАЕТ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОННЫХ ТОРГОВ ПО ПРОДАЖЕ ИМУЩЕСТВА УП «Проектный институт Брестгипрозем»**

| Наименование объекта | Начальная цена продажи, руб. без НДС | Размер задатка, руб. |
|---|---|---|
| **ЛОТ № 1.** Автомобиль легковой специальный Renault Duster, государственный номер 0491 IC-1, год выпуска – 2014 г. | **3 057,98** | **305,80** |
| **ЛОТ № 2.** Автомобиль легковой специальный Renault Duster, государственный номер 0492 IC-1, год выпуска – 2014 г. | **3 057,98** | **305,80** |
| **ЛОТ № 3.** Автомобиль легковой специальный Renault Duster, государственный номер 0493 IC-1, год выпуска – 2014 г. | **3 057,98** | **305,80** |

| | |
|---|---|
| **Организатор торгов** | РУП «Институт недвижимости и оценки» Брестский филиал |
| **Срок заключения договора купли-продажи** | Не позднее 20 рабочих дней с момента подписания протокола аукционных торгов |
| **Условия оплаты** | В соответствии с заключенным договором купли-продажи |
| **Условия продажи** | без условий |
| **Номер р/с для перечисления задатка** | р/с BY76BPSB30121789380179330000 в ОАО «БПС-Сбербанк» Региональная дирекция № 100 по Брестской области, г. Брест, ул. Мицкевича, 10 BIC Банка BPSBBY2X, УНП 201028245 |

**Аукцион состоится 7 февраля 2019 г. в 11.00 по адресу: г. Брест, ул. Наганова, 10 – 325 Брестский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки»**

**Перечень документов для участия в аукционных торгах и иную информацию можно узнать по телефонам: 8 (0162) 20-92-13; 21-88-81, 8 029 626 72 52**

**Заявления на участие в аукционе принимаются по адресу: г. Брест, ул. Наганова, 10, каб. 329 в рабочие дни с 9.00 до 17.00. Последний день приема заявлений – 6 февраля 2019 г. до 17.00**

### З ПЕРШЫХ ВУСНАЎ

**Павел ЯЛАВЫ, старшыня Брэсцкага гарадскога парламента, старшыня пярвічнай арганізацыі БРСМ Брэсцкага тэхнічнага ўніверсітэта:**

— Старшынёй гарадскога парламента мяне абралі ў 2017 годзе, тады я быў яшчэ студэнтам. Нас 40 чалавек у парламенце, у суполку ўваходзяць студэнты, навучэнцы прафтэхвучылішчаў, школьнікі і работнікі. Мы маем сваю групу ў сацыяльных сетках, праз яе абменьваемся ідэямі, інфармацыяй. Нас запрашалі на пасяджэнні прэзідыума Брэсцкага гарадскога Савета, дзе мы маглі назіраць за абмеркаваннем і вырашэннем надзённых праблем гарадскога жыцця. Мы таксама ходзім на занняткі школы маладога дэпутата, якую вядзе выкладчыца права Брэсцкага дзяржаўнага ўніверсітэта Святлана Цюга. Гэта школа арганізаваная найперш для дэпутатаў, якія абраны ўпершыню. Там разглядаюцца прававыя аспекты дзеяння Савета, паўнамоцтвы яго дэпутатаў, формы падачы дэпутацкіх запытаў. Але занякі карысныя і для нас, мы можам задаваць пытанні ў тым ліку і пра дзеянне сваёй маладзёжнай структуры. Сваю задачу бачым найперш у тым, каб агучыць праблемы моладзі, сваё разуменне шляхоў іх вырашэння тым людзям, якія прымаюць рашэнні.

Агульныя ж справы, у якіх удзельнічалі члены маладзёжнага парламента, гэта найперш суботнікі. Напрыклад, восенню мы прыбіралі Трышынскія могілкі — адны з найстарэйшых у Брэсце.

**Вікторыя САЛЯЙЧУК, старшыня маладзёжнага парламента Брэсцкага раёна, дырэктар Клейнікаўскай дзіцячай школы мастацтваў:**

— Наш парламент вельмі малады, яму крыху менш за два гады, але мы ўжо вызначыліся шэрагам добрых спраў і пачынанняў. А гэтым летам нават прайшлі перавыбары, бо многія з першага складу парламента паступілі ў вышэйшыя навучальныя ўстановы, ім у школах раёна знайшлася замена. На шчасце, ахвотных паспрабаваць свае сілы ў новай справе хапае.

Паводле вынікаў выбараў, у парламент увайшлі 26 чалавек. Большасць з іх — вучні старшых класаў, таксама восем чалавек, якія ўжо працуюць. Першай нашай агульнай справай быў удзел у выбарах мясцовых Саветаў у лютым. Дарослыя члены парламента выступалі ў якасці назіральнікаў на выбарчых участках, а маладзейшыя працавалі памочнікамі-валанцёрамі таксама на ўчастках.

Мы правялі некалькі сумесных мерапрыемстваў, ці, лепш сказаць, добрых спраў. Наш парламент арганізаваў і правёў дабрачынны канцэрт у Косічах. Усе сабраныя грошы мы перадалі маці хлопчыка-інваліда са Знаменкі на набыццё сучаснай каляскі. Гэтая справа неяк усіх згуртавала, юнакі і дзяўчаты ўбачылі канкрэтны вынік, што вось гэтаму пэўнаму чалавеку стала жыць крышачку больш камфортна.

І ўсё ж галоўны ўпор у рабоце я як кіраўнік парламента імкнуся рабіць на выхаванне ў юных парламентарыяў арганізатарскіх здольнасцяў і дзяржаўнага мыслення. Як дэпутат сельскага і раённага Саветаў часта сустракаюся з людзьмі. І мяне вельмі засмучае пазіцыя многіх, нават даволі маладых выбаршчыкаў. Яны любяць бурчэць, што мясцовыя Саветы нічога не вырашаюць, не маюць рэальнай улады. Але ж Саветы — гэта мы з вамі, і калі будзем сядзець на прызбе, то хто гэта зробіць? Вось мы ў парламенце вучымся вызначаць праблему і потым вырашаць яе. Напрыклад, недзе ўтварылася несанкцыянаваная звалка. Мы арганізоўваем суботнік і прыбіраем, калі яна невялікая. Калі ж там ужо цэлы склад старой бытавой тэхнікі альбо мэблі, паведамляем у сельсавет, у некаторых выпадках інфармуем раённы Савет.

Мы ўдзельнічалі ў многіх агульных справах. З намі падтрымліваюць сувязь і студэнты, былыя члены парламента, просім іх, калі не ўдзельнічаць у агульных мерапрыемствах, то хоць бы падтрымліваць ідэямі. І такія ідэі паступаюць. Як педагог, я радуюся, што дзеці ў агульных справах сталеюць на вачах. Такім чынам мы выхоўваем будучых дэпутатаў, грамадзян з актыўнай жыццёвай пазіцыяй.

**Уладзімір ХВАЦІК, старшыня Брэсцкага раённага Савета дэпутатаў:**

— Наш парламент вельмі дзейсны, творчы, ініцыятыўны. Нядаўна мы нават ім пасведчанні зрабілі і выдалі, каб падкрэсліць грамадскую значнасць гэтага маладзёжнага фарміравання. Членаў парламента запрашалі на сесіі, прэзідыумы раённага Савета, давалі ім магчымасць убачыць дэпутацкую работу ўвачавідкі.

Маладых людзей мы арыентуем на выхаванне ў іх якасцяў гаспадара на сваёй зямлі. Юныя парламентарыі лічаць сваім абавязкам не толькі ўдзельнічаць, калі праводзяцца акцыі па прыборцы тэрыторый, але і прыцягваць сваіх аднакласнікаў, сяброў, аднавяскоўцаў.

На сустрэчы з удзельнікамі маладзёжнага парламента я не раз ім гаварыў: калі бачыце нейкі непарадак на сваёй тэрыторыі, для пачатку праінфармуйце старшыню сельскага Савета, зрабіце здымак і адпраўце яму, а потым будзем разам думаць, як праблему вырашыць і які можа быць ваш удзел у гэтым вырашэнні.

І яшчэ. Вельмі важна, што ў парламент трапляюць маладыя людзі, якія прайшлі пэўны адбор. Хлопцы і дзяўчаты запаўняюць анкеты, дзе абгрунтоўваюць сваё жаданне ўдзельнічаць у названым фарміраванні. Значыць, маладыя людзі прыходзяць у маладзёжны парламент з жаданнем атрымаць вопыт для ўласнага развіцця і змяніць свет да лепшага.

**Падрыхтавала Святлана ЯСКЕВІЧ.**

# ПЛЯЦОЎКА ДЛЯ

***(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «МС».)***

— Маладзёжны парламент — гэта добрая магчымасць для ініцыятыўных маладых людзей навучыцца фармуляваць свае думкі, працаваць у камандзе і браць адказнасць на сябе. Важна даць магчымасць маладым ся-



бе рэалізаваць, — зазначыў Ігар Марзалюк. — Адной з такіх формаў і ёсць маладзёжны парламент. Дзейнасць такіх структур падтрымліваецца ў нашай краіне і паўсюдна ў свеце. Вельмі важна, калі моладзь разумее, што ад яе многае залежыць.

На думку дэпутата, маладзёжны парламент — гэта свайго роду індыкатар сучаснага жыцця моладзі. Бо юныя абраннікі могуць прапанаваць сваё бачанне заканатворчай дзейнасці. І такія прыклады ёсць. Ігар Марзалюк прызнаўся, што яго 16-гадовы сын Альгерд, які таксама нядаўна выйграў выбары, стаў старшынёй камісіі па самакіраванні і рэформе школы ад Магілёва. Дык вось, ён лічыць, што павінна быць пяць абавязковых дысцыплін для агульнага навучання, а ўсе астатнія — па выбары. Ці спраўдзяцца такія смелыя ідэі маладых дэпутатаў — пакажа час.

## Амаль дарослыя праекты

Дэпутаты Гродзенскага маладзёжнага парламента накіроўваюць сваю ўвагу на актуальныя праблемы жыцця. Старшыні розных камісій расказалі аб кірунках сваёй дзейнасці. Напрыклад, Яўгена Шэндзіка з Ваўкавыска хвалююць праблемы дзяцей-сірот. Таму ў сваёй перадвыбарнай праграме ён асноўнай задачай бачыць валанцёрскую дзейнасць. А дапаможа ў гэтым атрад, які Яўген мае намер стварыць з ліку сваіх аднадумцаў.

> Маладзёжны парламент — гэта адна з формаў праяўлення нашых ініцыятыў, але іх трэба ажыўляць. Галоўнае — магчымасць, усё астатняе залежыць ад асабістых якасцяў.

Кацярына Янголь са Смаргонскага раёна выступіла з праектам па прафілактыцы алкагольнай і наркатычнай залежнасці. Яна прывяла такі факт: да 80 % дарослых алкаголікаў пачалі злоўжываць спіртным падлеткамі. Гэтак жа і наркаманія. Кацярына лічыць, што для актывізацыі прафілактычных мер трэба задзейнічаць шосты школьны дзень. Праводзіць у суботу адпаведныя акцыі, сустрэчы з профільнымі спецыялістамі. Дзяўчына склала падрабязны план дзейнасці на бягучы год.

Мабільную праграму прапануе стварыць Таццяна Жукавец з Гродна, якая ўзначальвае камісію па вучнёўскім самакіраванні і падтрымцы дзіцячай ініцыятывы. Распрацаваць яе бяруцца студэнты ГрДУ імя Янкі Купалы. Такая праграма стане добрай дапамогай замежным студэнтам і ўвогуле турыстам, бо будзе даступная на чатырох мовах праз мабільныя тэлефоны без аўтарызацыі.

Да спартыўнага праекта прапанаваў далучыцца Ягор Сідзельнік са Шчучынскага раёна. Ён — аматар спорту і ўзначальвае камісію па арганізацыі вольнага часу і папулярызацыі фізічнай культуры. Яго мэта — уладкаваць як мага больш баскетбольных пляцовак. Такі праект, лічыць хлопец, па сілах ажыццявіць і маладзёжнаму парламенту. Ёсць і канкрэтныя ідэі: прыцягнуць да рэалізацыі прадпрыемства па выпуску гумовага пакрыцця, якое выпрацоўваецца са старых шын. На адну пляцоўку, па яго падліках, трэба 26 тысяч рублёў.

На спонсараў разлічвае ў сваім праекце гродзенскі дэпутат маладзёжнага парламента гімназіст Натан Шамсутдзінаў. Ён прапануе маштабны праект па ўзнаўленні яўрэйскага квартала ў Гродне ў раёне дзеючай харальнай сінагогі. Ужо ёсць інвестары, якія гатовы набыць два будынкі старога горада і ўзнавіць іх. Натан расказаў, што яго каманда шукае гранты, партнёраў, зацікаўленых асоб. Разлічваюць ініцыятары праекта і на культурны дабрачынны фонд, створаны на базе сінагогі. Дарэчы, гэты праект на конкурсе ідэй прызнаны адным з найлепшых у мінулым годзе.

## Вынікі і новы фармат

Як расказала **начальнік аддзела выхаваўчай і сацыяльнай работы галоўнага ўпраўлення адукацыі Гродзенскага аблвыканкама Таццяна АСМАЛОЎСКАЯ,**

# СЁННЯ МАЛАДЫ ЗАЎТРА —

**У верасні 2012 года ў Слуцку адбылася значная падзея — далучэнне да глабальнай ініцыятывы ЮНІСЕФ «Горад, дружалюбны да дзяцей». У межах праекта быў створаны маладзёжны парламент, у які ўвайшлі шэсцьдзясят восем навучэнцаў 9—11 класаў з усіх устаноў адукацыі Слуцка. Самыя ініцыятыўныя былі абраны ў Савет парламента. Юнакі і дзяўчаты ўнеслі ў маладзёжнае жыццё новыя ідэі, ініцыятывы.**

— Адзін з самых яркіх праектаў — агляд-конкурс харэаграфічнай творчасці «Вясенні вальс», які ладзіцца ў маі і сёлета будзе праходзіць сёмы раз. Да яго дзеці доўга і старанна рыхтуюцца, літаральна з першых дзён навучальнага года. Каманда кожнай школы рыхтуе яркія, маляўнічыя нумары, — расказала **намеснік дырэктара Слуцкага цэнтра дзіцячай творчасці, куратар маладзёжнага парламента Алена КАЛЯДА.**

— Абавязковая ўмова конкурсу — станцаваць менавіта вальс. Гэтае ўменне спатрэбіцца дзецям у далейшым жыцці. У грацыёзным, вытанчаным танцы юнакі і дзяўчаты закружацца падчас выпускнога школьнага балю, вяселля, — лічыць **метадыст па рабоце з дзіцячымі і маладзёжнымі грамадскімі аб'яднаннямі, куратар маладзёжнага парламента Вольга АВВАКУМАВА.** — І задача педагогаў — навучыць выхаванцаў класічнаму танцу, паказаць ім яго хараство, эстэтыку. Агульнае захапленне збліжае дзяцей, умацоўвае дружбу, дае магчымасць больш даведацца адно аб адным у час агульных рэпетыцый.

«Мы танцуем вальс, таму, што гэта — класіка. Тым не менш у выкананне нумара можна ўнесці і нейкую адметнасць, цікавінку, імправізацыю, — упэўнены школьнікі. — Харэаграфія не перашкаджае вучобе, а, наадварот, дапамагае, паколькі дазваляе стаць больш адказнымі,

Фота Яўгена ПЯСЕЦКАГА.




Куратары Слуцкага маладзёжнага парламента Алена КАЛЯДА і Вольга АВВАКУМАВА з гонарам паказалі нам узнагароды, атрыманыя ад Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь і прадстаўніцтва ЮНІСЕФ.

Тэлесеткі

# ГІСТОРЫЯ Ў БІЯГРАФІЯХ

**Да 100-годдзя ўтварэння БССР, якое адзначаецца сёлета, тэлеканал «Беларусь 1» падрыхтаваў адмысловы праект — публіцыстычныя партрэты людзей, якія прымалі самы непасрэдны ўдзел у гістарычных падзеях. Змiцер Жылуновіч, Аляксандр Чарвякоў, Вільгельм Кнорын, Аляксандр Мясніковў — некалі гэтыя імёны былі вядомыя ўсёй краіне, але пазней біяграфіі гэтых дзяржаўных дзеячаў шчыльна рэдагаваліся і «падчышчаліся», таму сучасныя беларусы ведаюць пра дасягненні, жыццёвыя прынцыпы і ідэалы гэтых людзей не так і шмат.**



Запоўніць гэтыя прабелы тэлевізійнікі пастараліся ў чатырохсерыйнай дакументальнай драме «БССР. Невядомая гісторыя», што выйдзе ў эфір з 8 па 11 студзеня. «Гэта спроба расказаць гісторыю з пункту гледжання сучаснасці, не ідэалізуючы, але суперажываючы», — падкрэслівае аўтар серыяла Вікторыя Касянюк. Каб адшукаць і праверыць цікавыя факты, убачыць арыгіналы важных дакументаў, абмеркаваць розныя версіі падзей з вядомымі гісторыкамі і сустрэцца з нашчадкамі сваіх герояў, здымачная група праекта пабывала не толькі ў розных гарадах Беларусі, але таксама ў Смаленску, Маскве, Ерэване. Удалося адшукаць, напрыклад, унучатую пляменніцу Змітра Жылуновіча — не толькі бальшавіцкага дзеяча, але і паэта Цішкі Гартнага, моднага дэндзі і ахвяры палітычных гульняў, які дабіваўся прызнання беларусаў самастойнай нацыяй, але быў выключаны з партыі, арыштаваны,названы псіхічна хворым і памёр у псіхіятрычнай лякарні пры цьмяных абставінах...

Дакументальны серыял унікальны тым, што некаторыя нашчадкі вядомых гістарычных дзеячаў упершыню пагадзіліся даць інтэрв'ю перад камерамі. Рэканструяваць падзеі мінулага рэжысёры Яна Шаблыка і Алег Рудзін паспрабавалі з дапамогай журналісцкіх расследаванняў, мізансцэн з удзелам акцёраў Алега Коца (Мяснікоў), Валерыя Глазкова (Жылуновіч), Дзмітрыя Саснова (Кнорын) і Паўла Бельскага (Чарвякоў) і гульні са святлом і ценямі, якія запаўняюць тую ці іншую недаказанасць.

**Вікторыя ЗАХАРАВА.**
**Крыніца фота БТРК.**

## ШАШКІ
**(«Звязда»)** **Выпуск № 79**

З 17 па 22 снежня ў Маскве (Расія) праходзіў чэмпіянат Еўропы па шашках-100 сярод мужчын і жанчын. На ім сенсацыйна выступіў беларускі майстар Міхаіл Семянюк, які здолеў апярэдзіць каля 20 міжнародных гросмайстраў і заваяваць званне чэмпіёна Еўропы. Міхаіл атрымаў пуцёўку на чэмпіянат свету і права на прысваенне звання міжнароднага гросмайстра. Ён першы з беларускіх шашыстаў стаў уладальнікам найвышэйшага спартыўнага звання па шашках-64 і па шашках-100. Трэба адзначыць што для таленавітага маладога спартсмена 2018 год выдаўся вельмі ўдалым. У шашках-64 ён стаў абсалютным чэмпіёнам Еўропы і свету сярод юніёраў, заваяваўшы па тры залатыя медалі. У шашкі-100 перамог у класічнай праграме чэмпіянатаў Еўропы і свету сярод юніёраў.

Пуцёўку на чэмпіянат свету заваяваў і чэмпіён Беларусі гросмайстар Яўген Ватуцін, які стаў чацвёртым.

У жаночым чэмпіянаце прадстаўніцы Беларусі Дар'я Федаровіч — на пятым месцы, Паліна Петрусёва стала дзявятай. Абедзве яны кваліфікаваліся на чэмпіянат свету.

Паглядзіце цікавы фрагмент гульні.

№ 90. А. Георгіеў — М. Семянюк.

**Белыя простыя шашкі:** 15, 27, 28, 32, 35, 37, 38, 41, 43, 45, 47, 49 (12).

**Чорныя простыя шашкі:** 2, 5, 6, 7, 8, 9, 12, 16, 18, 24, 26, 34 (12).

Па дошцы пранёсся камбінацыйны віхор:

29... 16-21 30. 27х16 18-22 31. 28х17 12х21 32. 16х27 24-30 33. 35х24 34-40 34. 45х34 05-10 35. 15х13 08х48 36. 41-36 48х22 37. 32-27 22х31 38. 36х27 — і неўзабаве партыя скончылася нічыёй.

Для самастойнага рашэння прапануюцца задумкі нашага чытача з Барысава Юрыя Мурадава.

№ 91



**Белыя простыя шашкі:** c3, d6, g5, белыя дамкі: b2 (4).

**Чорныя простыя шашкі:** a5, d8, g7, чорныя дамкі: h4 (4).

№ 92

**Белыя простыя шашкі:** c3, e3, g1, g5 (4)

**Чорныя простыя шашкі:** a3, a7, e5, g3, h4 (5)

№ 93

**Белыя простыя шашкі:** a7, g3, g7 (3).

**Чорныя простыя шашкі:** a5, g5, чорныя дамкі: g1 (3).

Ва ўсіх пазіцыях белыя пачынаюць і выйграюць.

Прозвішчы чытачоў, якія дашлюць правільныя адказы, будуць апублікаваныя.

Праверце свае рашэнні: выпуск № 78 ад 21.12.18.

№ 87 1.ed8 f:f2 2.dh4 e:g5 3.h:g1 x.

№ 88 1.ef8 f:f2 2.dc7 b:d6 3.f:g1 dc3 4.ab8 cb2 5.gb6 a:c7 6.b:a1 x.

№ 89 1.fg7 h:f2 2.ab8 e:g5 3.b:a1 ab4 4.h:f4 bc3 5.fe5 d:f6 6.a1:g7 x.

Правільныя адказы даслалі В. Дударэвіч *(в. Новая Мыш Баранавіцкага р-на)*, Ф. Карпей (Мядзел), У. Статкевіч *(п. Зялёны Бор, Івацэвіцкі р-н)*, У. Панько *(Камянец)*, І. Ананіч *(Гродна)*, А. Шурпін *(Івянец)*, В. Ваўчкоў *(Маладзечна)*, П. і В. Шульгі, А. Ліцьвінаў *(усе — Мінск)*, В. Таўкачоў *(Клімавіцкі р-н)*, В. Бандарык *(Мінскі р-н)*.

Пішыце на адрас: 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10а, газета «Звязда»; e-mail: info@zviazda.by або vorush@yandex.ru

**Віталь ВАРУШЫЛА,**
**майстар спорту.**

# ТЭЛЕТЫДЗЕНЬ




Сядзі і глядзі

## Цуд уласнымі рукамі



### «ЗІМОВЫ РАМАН»
**АНТ, 8 студзеня**

Ніна Пятроўна і Сяргей Ільіч жывуць у гарадскіх кватэрах разам з дзецьмі, унукамі і нават праўнукамі, прычым малодшае пакаленне мала цікавяць патрэбы і інтарэсы пажылых сваякоў. Аднойчы тыя выпадкова сустракаюцца ў бістро, знаёмяцца і знаходзяць агульную мову — і едуць жыць на лецішча. Дзеці старэюча вярнуць «запозненых рамантыкаў» з нябёсаў на зямлю і прымусова адпраўляюць Ніну Пятроўну ў бальніцу, аднак тут у справу ўступаюць унукі, якія вераць у шчырыя пачуцці і гуляюць на баку старых...

### «ГЭТЫЯ ВОЧЫ НАСУПРАЦЬ»
**«Беларусь 3», з 8 студзеня**



Шматсерыйная гісторыя пра тое, як просты хлопец з Адэсы, які не выконваў камсамольскіх песень, але ў сваім лірычным амплуа стаў улюбёнцам усяго Савецкага Саюза — эстрадная зоркай Валерыем Абадзінскім. Зрэшты, гэтая адметнасць і бескампраміснасць з часам пазбавілі спевака месца пад эстрадным сонцам, і паступова ён увогуле знік. Толькі праз гады верная прыхільніца выпадкова прызнае ў фабрычным вартаўніку свайго куміра і літаральна вяртае таму прагу жыцця і творчыя крылы.



### «САМАРА»
**«Беларусь 2», з 9 студзеня**

Галоўны персанаж гэтага серыяла — урач хуткай дапамогі Алег Самарын — бунтар і працаўнік усталяваных нормаў, які кпіць з калег ды пацыентаў і папросту спрачаецца з начальствам. Няпросты характар Самары, як называюць яго сябры, кампенсуюць залатыя рукі, бо ён хірург ад Бога, які штодня ратуе чалавечыя жыцці, а часам нават лекуе душы. І ніхто не здагадваецца, што Самарын і сам захоўвае таямніцу, раскрыццё якой пагражае стратай любімай працы. Але ўсё таемнае калі-небудзь робіцца яўным...

### «ШАНЦУЕ Ж ЛЮДЗЯМ!»
**МІР, 13 студзеня**



Актрыса-пачатковец Соня і малады інжынер Косця вараца кожны ў сваіх праблемах: яна не мае ні годных роляў, ні грошай, ён пакутуе ад рэўнасці нявесты. У перадапошні дзень года, калі татальнае нешанцаванне дасягае крытычнай адзнакі, Соня ледзьве не трапляе пад машыну Косці і памылкова забірае ягоную папку з важнымі дакументамі, і далейшыя непрыемнасці ім давядзецца пераадольваць ужо разам.



### «ЦУД»
**«Беларусь 1», з 8 студзеня**

Калі прадстаўніца тусовачнай «залатой моладзі» Аня даведваецца, што цяжарная ад свайго гламурнага бойфрэнда, то без ценю сумневу вырашае пазбавіцца ад такой перашкоды для свайго беструрботнага жыцця. І тут адбываецца неверагоднае — дзіцячы голас з ніадкуль угаворвае захаваць малому жыццё. Тым часам бацька Ані, экс-міністр, аказваецца фігурантам карупцыйнай справы і ўцякае за мяжу, а ўсю яго маёмасць канфіскуюць — і будучая маці, якая раней не працавала ні дня, з дапамогай свайго нябачнага памочніка вымушаная вучыцца па-новаму глядзець на свет...

## Што цурок, што малая сошка

У гэтым сезоне змяніўся фармат — парламент стаў двухпалатным. Акрамя школьнікаў, яго членамі сталі студэнты ВНУ і навучэнцы сярэдніх прафесійных устаноў. Усяго ў дэпутацкі корпус увайшлі больш за 120 чалавек, якія абраны шляхам прамога закрытага галасавання па аналогіі з «дарослымі» выбарамі.

— На сесіі прадстаўлены пяць найлепшых праектаў — па адным ад кожнай камісіі, — якія прыняты дэпутатамі, мадэратарамі камісіі. Праекты будуць рэалізаваны ў рамках работы будучага парламента, — адзначыла Тацццяна Асмалоўская.

Разлічваюць маладыя парламентарыі і на шэфства «дарослага» дэпутацкага корпуса. Старшыня Гродзенскага абласнога Савета дэпутатаў Ігар Жук зацікаўлены ў падрыхтоўцы будучага рэзерву:

— Мы працуем па многіх кірунках з моладдзю, выяўляем таленавітых, адораных дзяцей, зацікаўлены, каб іх ініцыятывы былі рэалізаваны — ад гэтага будзе карысць усім.

## «Усё залежыць ад нас»

На пасаду старшыні маладзёжнага парламента прапанавалі некалькі кандыдатур. Удзельнікі сесіі большасцю галасоў абралі ліцэістку Тацццяну Жукавец. Магчыма, усіх падкупіла яе яскравая прэзентацыя і той запал, з якім яна выступіла. Адразу пасля галасавання Тацццяна шчыра адказала на пытанні аб тым, якой яна бачыць сваю работу ў новым парламенце.

***— Ці стала для вас абранне на пост старшыні маладзёжнага парламента нечаканасцю?***

— Па праўдзе, так. Мне здавалася, што пераможа Натан са сваім цікавым праектам яўрэйскага квартала.

***— Магчыма, адыграў ролю не толькі праект, але і нейкія лідарскія якасці? Як вы бычыце сваю будучую дзейнасць?***

— Я нават зараз бачу, што частка парламента даволі пасіўная. У нас на выбарах было 11 прэтэндэнтаў, з якіх рэальна дастойнымі я назвала б палову. Астатнія вельмі блыталіся, выказвалі свае думкі штампамі. Каму гэта цікава слухаць, а тым больш падтрымліваць? Трэба выказваць думкі выразна, імкліва. Мы — моладзь, у нас кроў кіпіць у жылах, чаму мы павінны разменьвацца на доўгія і нудныя размовы і абмеркаванні, калі можна ўсё выказаць па сутнасці. Маладзёжны парламент — гэта адна з формаў праяўлення нашых ініцыятыў, але іх трэба ажыўляць. Галоўнае — магчымасць, усё астатняе залежыць ад асабістых якасцяў.

> Маладзёжны парламент у вобласці працуе ўжо шэсць гадоў. За гэты час рэалізавана 400 знакавых крэатыўных праектаў.

**Маргарыта УШКЕВІЧ.**



Фота Мікалая ЛАПІНА.

КАМПЕТЭНТНА



**Аляксандр СЯГОДНІК, намеснік старшыні Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Беларусі па адукацыі, культуры і навуцы, намеснік старшыні камісіі па сацыяльнай і маладзёжнай палітыцы, навуцы, культуры і гуманітарных пытаннях Парламенцкага сходу Саюза Беларусі і Расіі:**

— Калі весці гаворку аб вытоках маладзёжнага парламентарызму, то ўсё зараджалася ў рэгіёнах, гэта значыць, што пачатак паклалі мясцовыя органы ўлады. Напрыклад, мы стварылі Гродзенскі маладзёжны парламент пры абласным Савеце дэпутатаў у 2011 годзе (на той час Аляксандр Сягоднік узначальваў упраўленне адукацыі аблвыканкама. — **Заўв. аўт.**), і такая работа праводзілася па ўсіх рэгіёнах. Мэта стварэння такіх парламентаў — сфарміраваць органы самакіравання ў маладзёжным асяродку, далучыць моладзь да вырашэння праблем перш за ўсё рэгіянальнага ўзроўню, меназіва тых, што датычацца рэалізацыі маладзёжнай палітыкі. Між іншым, сярод другіх задач, якія паўстаюць перад гэтымі інстытуцыямі, мы бачылі яшчэ і актывізацыю ініцыятывы, каб моладзь людзі не толькі ўплывалі на вырашэнне праблемных пытанняў, але і ўзнімалі іх. Акрамя таго, яны могуць далучацца і да іншых праектаў, якія ім па сілах: валанцёрскага руху, удзелу ў добраўпарадкаванні сваіх населеных пунктаў ды іншых.

Яшчэ некалькі слоў аб стварэнні маладзёжнай палаты пры Парламенцкім сходзе, якая з'явілася ў 2018 годзе па ініцыятыве двух старшынь — Вячаслава Валодзіна і Уладзіміра Андрэйчанкі. Яе стварэннем займаліся дзве камісіі — наша камісія па сацыяльнай і маладзёжнай палітыцы, навуцы, культуры і гуманітарных пытаннях і па заканадаўстве і рэгламенце. Яна складаецца з маладых парламентарыяў Беларусі і Расіі — па 20 ад кожнай краіны. У Брэсце на летняй сесіі была зацверджана структура, органы кіравання, прынята палажэнне і пачалася работа. На мінулай 55-й сесіі Парламенцкага сходу Саюза Беларусі і Расіі была дадзена першая справаздача з боку кіраўніка Маладзёжнай палаты і агучаны планы на 2019 год.

ІНІЦЫЯТЫВЫ

# ПАРЛАМЕНТАРЫЙ, ДЭПУТАТ

сабранымі, стараннымі, упэўнена трымацца ў любой аўдыторыі.

Па выніках агляду вызначаецца каманда-пераможца, якой уручаецца Гран-пры — пераходны Кубак. У далейшым прызёры паказваюць нумары падчас мерапрыемстваў, якія ладзяцца да Дня Перамогі. Да гэтага свята прымеркавана яшчэ адна акцыя. Хлопцы і дзяўчаты фатаграфуюць віды Слуцка, удзельнікаў вайны, памятныя мясціны горада і падаюць свае работы на конкурс. Тым самым яны заклікаюць сваіх равеснікаў быць удзячнымі ветэранам за тое, што прынеслі наступным пакаленням мір, помніць пра герояў вайны і шанаваць іх. Гэтыя здымкі захоўваюцца ў архіве, выкарыстоўваюцца ў паўсядзённай рабоце, дэманструюцца на выстаўках.

Традыцыйна моладзь праводзіць таксама дабрачынную акцыю «Цуды на Каляды». Піянеры, прадстаўнікі раённай арганізацыі Беларускага рэспубліканскага саюза моладзі, школьнікі збіраюць канцылярскія тавары і спартыўныя прылады, цацкі, а члены маладзёжнага парламента рыхтуюць тэатралізаванае прадстаўленне. Затым усе разам наведваюць дзіцячае аддзяленне раённай бальніцы, цэнтр карэкцыйнага развіцця, сацыяльна-педагагічны цэнтр, спецыялізаваны Дом дзіцяці, віншуюць малых і ўручаюць ім падарункі.

Сёлета чацвёрты раз у горадзе арганізуюць пляцоўкі для маладзёжнага адпачынку, якія ініцыяваў парламент: спартыўная, творчая, гісторыка-культурная. Як паказвае папярэдні вопыт, такія тэматычныя мерапрыемствы карыстаюцца папулярнасцю. З кожным годам яны ўдасканальваюцца, збіраюць усё большую колькасць удзельнікаў.

Але, як лічаць Алена і Вольга, маладзёжны адпачынак неабходна, разнастаіць. Таму на лета мяркуюць уладкаваць адкрытыя тэматычныя пляцоўкі на вуліцы.

Што наогул чакаюць куратары ад сваіх падапечных, пацікавілася ў суразмоўнікаў. Магчыма, мараць аб тым, каб у будучыні выхаванцы былі абраны ў парламент краіны, вырашалі дзяржаўныя справы, уносілі свае прапановы ў заканадаўства?

— Мы ў іх верым. Яны вучацца працаваць з людзьмі, становяцца лідарамі, праходзяць трэнінгі, дзе набываюць неабходныя навыкі, каб іх не толькі выслухалі, але і пачулі, — кажуць куратары.— Маладзёжны парламент — гэта звяно ў партнёрскім супрацоўніцтве паміж дзецьмі і прадстаўнікамі раённай улады. Іх запрашаюць у райвыканкам для абмеркавання пытанняў, звязаных з маладзёжнымі ініцыятывамі горада. У кіраўніцтва раёна іх ідэі заўсёды знаходзяць падтрымку.

Дзеці сустракаліся з дэпутатам Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Беларусі Наталляй Ражанец. Наталля Віталеўна правяла для іх экскурсію па Авальнай зале, расказала аб рабоце сваіх калег. Слуцкія парламентарыі наведваюць таксама іншыя маладзёжныя парламенты. Пабывалі ў Брэсце, Барысаве, Полацку, Маладзечне, наладзілі сувязі са сваімі равеснікамі, пачарпнулі ў іх карысны вопыт ды і сваім падзяліліся.

І нават калі яны не стануць дэпутатамі, то, безумоўна, вопыт работы ў маладзёжным парламенце дапаможа ім у жыцці.

**Тацццяна ЛАЗОЎСКАЯ.**

ДАРЭЧЫ

## Будзе свая інтэрнэт-платформа

**Маладзёжная палата пры Парламенцкім сходзе распрацуе праект Стратэгіі развіцця маладзёжнай інтэграцыі Саюзнай дзяржавы.**

На 55-й сесіі Парламенцкага сходу, якая прайшла ў канцы мінулага года, парламентарыі разгледзелі пытанне «Аб дзейнасці Маладзёжнай палаты пры Парламенцкім сходзе Саюза Беларусі і Расіі». Аб гэтым паведамляе афіцыйны рэсурс Парламенцкага сходу Саюза Беларусі і Расіі.

З інфармацыяй аб выніках працы ў 2018 годзе і аб плане работы на 2019 год дэпутатаў пазнаёміла старшыня Маладзёжнай палаты пры Парламенцкім сходзе Саюза Беларусі і Расіі Алена Яракіна. Дэпутаты Парламенцкага сходу пагадзіліся з асноўнымі напрамкамі дзейнасці Маладзёжнай палаты, а таксама планам работы моладзі ў 2019-м.

У адпаведнасці з гэтым дакументам члены Маладзёжнай палаты распрацуюць Стратэгію развіцця маладзёжнай інтэграцыі Саюзнай дзяржавы, правядуць маніторынг нарматыўна-прававой базы, якая закранае інтарэсы моладзі, прымуць удзел у распрацоўцы рэкамендацый па рэгуляванні і развіцці дзейнасці ў сферы маладзёжнага парламентарызму, арганізуюць правядзенне сацыялагічнага даследавання сярод моладзі Саюзнай дзяржавы, выпрацуюць прапановы па стварэнні маладзёжнай інтэрнэт-платформы.

## Інфармацыйная палітыка і развіццё тэхналогій

**Тое, што хвалюе моладзь дзвюх краін, абмеркавалі на пасяджэнні камісіі Маладзёжнай палаты Саюзнай дзяржавы.**

У Маскве ў выдавецкім доме «Камсамольская праўда» прайшло пасяджэнне камісіі Маладзёжнай палаты пры Парламенцкім сходзе Саюза Беларусі і Расіі. На сустрэчы абмяркоўваліся пытанні інфармацыйнай палітыкі і развіцця інфармацыйных тэхналогій у Саюзнай дзяржаве, перадае тэлеканал «БелРос».

Яе ўдзельнікі закранулі праблему пазнавальнасці гэтага аб'яднання сярод жыхароў дзвюх краін. Асобна разгледзелі прынцыпы стварэння маладзёжнай інтэрнэт-платформы, якая дазволіла б вызначаць найбольш актыўных удзельнікаў мерапрыемстваў для грамадзян Беларусі і Расіі. Канцэпцыя прадугледжвае сістэму бонусаў для ўдзельнікаў.

«Цяпер на камісіі мы абмяркоўвалі праект стварэння інтэрнэт-платформы па схеме перадачы вопыту ад маладых спецыялістаў. Мы будзем браць двух спецыялістаў з дзвюх краін і параўноўваць, як яны дамагліся поспеху», — адзначыў член камісіі Сяргей Надольскі.

Абмеркавалі на сустрэчы і праект Стратэгіі развіцця маладзёжнай інтэграцыі Саюзнай дзяржавы. Парламентарыі падкрэслілі: пры распрацоўцы дакумента ў ім павінны быць улічаны пытанні эканамічнай палітыкі. Пагаварылі і пра вынікі працы Маладзёжнай палаты ў 2018 годзе. «Безумоўна, тое, што мы сёння выйшлі на распрацоўку канцэптуальных стратэгічных дакументаў па ініцыятыве самой моладзі, і тое, што гэтая ініцыятыва знайшла сваё замацаванне ў выніковых дакументах Форуму рэгіёнаў, — гэта пэўны вынік. Тое, што мы сёння эфектыўна ўзаемадзейнічаем з грамадскімі арганізацыямі дзвюх краін, — гэта таксама вынік. Вядома, за гэтыя паўгода (што існуе палата. — **«МС»**) мы пакуль наладжваем унутраную структуру, пакуль неабходна выбудаваць арганізацыйныя пытанні», — адзначыў намеснік старшыні Маладзёжнай палаты Ягор Макарэвіч.

# УСЁ ПА-ДАРОСЛАМУ

## Што вабіць магілёўскіх юнакоў і дзяўчат у маладзёжны парламент?

**Тут усё па-сур'ёзнаму, нягледзячы на тое, што гэтыя дэпутаты, па сутнасці, яшчэ дзеці. Але для актыўных і крэатыўных маладзёжны парламент — добрая пляцоўка для таго, каб паспрабаваць нешта рэальна змяніць. Плюс новы вопыт, карысныя веды і вельмі добры шанц заявіць пра сябе.**



Маладзёжны парламент пры гарадскім Савеце дэпутатаў існуе ў Магілёве ўжо пяты год, летась прайшлі трэція выбары ў яго склад. У адрозненне ад «дарослага» парламента, тэрмін дэпутацкай дзейнасці тут абмяжоўваецца двума гадамі. У выбарах задзейнічаны школьнікі, пачынаючы з 9 класа, а таксама навучэнцы і студэнты ВНУ да трэцяга курса. Гэтым разам з болей чым 200 прэтэндэнтаў абрана 64 чалавекі. Большую актыўнасць на выбарах праявілі дзяўчаты — іх у маладзёжным парламенце трэцяга склікання аж 44.

Першая сесія адбылася якраз напярэдадні Новага года. На ёй быў зацверджаны склад парламента, план работы, спіс камісій, асноўныя кірункі дзейнасці.

— Плануем больш актыўна займацца сацыяльнымі праектамі і заканатворчай дзейнасцю, — удакладніў **старшыня маладзёжнага парламента Яраслаў ГРЫГОР'ЕЎ.** Зараз ён студэнт другога курса Беларускага інстытута правазнаўства, але яго дэпутацкі стаж «адлічваецца» яшчэ са школы. Прызнаецца, што грамадская работа зацвердзіла яго ў жаданні стаць юрыстам.

Падтрымаць маладых калег прыйшлі дэпутаты Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь Ігар Марзалюк і Вольга Петрашова.

Яраслаў Грыгор'еў прызнаецца, што ў парламент прыйшоў з цікавасці. Хацелася паспрабаваць сябе ў новай ролі. Сёння маладыя парламентарыі адны з галоўных удзельнікаў розных сацыяльных праектаў.

— Нядаўна ў Магілёве праходзіў тэлемарафон добрых спраў, мы таксама далучыліся, — прыводзіць прыклад Яраслаў. — Сабралі вялікую скрыню падарункаў — цацкі, канцылярскія прылады, развівальныя гульні. Падчас марафону хадзілі ў якасці валанцёраў у анкалагічнае аддзяленне абласной бальніцы, рабілі невялічкія прадстаўленні. З дэпутатамі гарадскога і абласнога Саветаў дэпутатаў наведвалі сацыяльныя ўстановы.

Для маладых людзей парламент гэта яшчэ і добрая адукацыйная пляцоўка.

— Мне цікава, як адбываецца кіраванне горадам, як фарміруецца той жа бюджэт, — кажа Яраслаў. — У нас ёсць магчымасць убачыць, дзе наша дапамога больш за ўсё патрэбна. Калі мы чуем, што на нешта не хапае грошай, пачынаем шукаць варыянты, дзе іх знайсці — еўрапейскія праграмы, гранты, нешта іншае. Усё гэта абмяркоўваем з дэпутатамі гарсавета. Калі ва ўсім гэтым варышся, з'яўляецца азарт і жаданне рабіць нешта карыснае.

Маладым парламентарыям лягчэй данесці да шырокай грамадскасці тыя праблемы, якія існуюць у іх асяроддзі.

— Падымалі, напрыклад, пытанне па інклюзіўнай адукацыі, — кажа Яраслаў. — У нашым парламенце ёсць прадстаўнікі «асаблівай» моладзі, якія агучваюць праблемы маладых людзей з абмежаванымі магчымасцямі. Пра гэта мы размаўлялі з дэпутатамі Нацыянальнага сходу, абмяркоўвалі з імі, чаго не хапае і што для гэтага трэба зрабіць. І вельмі добра нас тут падтрымлівае дэпутат Вольга Петрашова.

У найбліжэйшых планах магілёўскага маладзёжнага парламента ўвесці ў курс справы навічкоў і разам з гарсаветам працаваць над сумеснымі праектамі.

— Ці цяжка быць старшынёй маладзёжнага парламента? Чым прыходзіцца ахвяраваць? — пытаюся ў суразмоўніка.

— Асабістага жыцця сапраўды няма, — усміхаецца Яраслаў. — Раней я яшчэ і спортам займаўся. Але пачаліся праблемы са здароўем. Зараз цалкам прысвяціў сябе вучобе і грамадскай дзейнасці. Пакуль усё атрымліваецца.

**Нэлі ЗІГУЛЯ.**

❍ Каментарый у тэму

**Андрэй КІБЛОЎ, старшыня Магілёўскага гарсавета дэпутатаў:**

— Асноўная мэта маладзёжнага парламента — гэта навучанне юнакоў і дзяўчат прынцыпам мясцовага самакіравання ў горадзе, падрыхтоўка будучых дэпутатаў і кіраўнікоў. Мы вітаем развіццё лідарскіх якасцяў, генерацыю ідэй на паляпшэнне жыццядзейнасці ў горадзе. Нам важна, каб маладыя людзі самастойна прымалі рашэнні. Моладзь праяўляе цікавасць да сацыяльных праблем, удзельнічае ў валанцёрскім руху, падтрымлівае ідэі інклюзіўнай адукацыі.

Дэпутацкая дзейнасць своеасаблівая, часта не хапае ведаў нават звычайным дэпутатам. Наш гарсавет падчас апошніх выбараў абнавіўся на 40 %. Я сам навічок у гэтай дзейнасці, і мне таксама прыйшлося чамусьці вучыцца. Усе павінны ведаць асновы дзейнасці дэпутата — нарматыўную базу, умець складаць планы работ, даваць справаздачу выбаршчыкам, правільна рабіць дэпутацкія запыты і звароты і гэтак далей. Таму мы вырашылі зрабіць школу дэпутата.

МЯСЦОВЫ ЧАС

# Прыехаць у глыбінку. І застацца

## Сустрэчы з маладымі спецыялістамі прайшлі ў раёнах Брэстчыны

**У канцы года райвыканкамы традыцыйна праводзяць сустрэчы з тымі спецыялістамі, якія скончылі навучальныя ўстановы і прыехалі на работу ў арганізацыі, прадпрыемствы, установы раёна. Недзе арганізоўваюць мерапрыемствы ў форме вучобы-семінара, як, напрыклад, было ў Кобрыне. Там з моладдзю сустрэліся кампетэнтныя спецыялісты, якія расказалі пра льготы і магчымасці, што гарантуе дзяржава пры працаўладкаванні па размеркаванні, пазнаёмілі з асаблівасцямі раёна, яго дасягненнямі ў розных галінах гаспадаркі.**



**Удзельнікі сустрэчы ў Ганцавічах.**

У іншых раёнах, асабліва там, дзе сустрэчы ладзіліся перад Новым годам, яны праходзілі ў форме «агеньчыка». На мерапрыемствах юнакі і дзяўчаты ў нефармальнай абстаноўцы за чаем абмяркоўвалі з кіраўнікамі і спецыялістамі раённага звяна тыя ж праблемы, задавалі пытанні, якія іх цікавяць.

Адным словам, сустрэчы ў любых формах атрымліваюцца карыснымі, дзейснымі, і не толькі ў плане інфармавання маладых спецыялістаў. Яны даюць магчымасць пазнаёміцца, каб потым больш цесна камунікаваць, удзельнічаць у агульных грамадска карысных праектах, якія абавязкова прапаноўваюць грамадскімі арганізацыямі. Звычайна ў такіх сустрэчах актыўны ўдзел прымаюць кіраўнікі БРСМ, прафсаюзных, іншых арганізацый.

Скажам, у Пружанах старшыня прафсаюза АПК Іван Ярома найперш расказаў аб прававой дапамозе, на якую могуць разлічваць члены арганізацыі, а таксама пра культурныя, спартыўныя мерапрыемствы, якія праводзяцца ў сельгаспрадпрыемствах, пра тое, як цікава можна бавіць вольны час, нават калі ты прыехаў на працу ў вёску. А вось **старшыня райвыканкама Міхаіл КРЭЙДЗІЧ** зрабіў упор на сацыяльную падтрымку, якая гарантавана з боку дзяржавы. Кіраўнік раёна таксама нагадаў маладым работнікам, што іх пасяховасць у жыцці ў многім будзе абумоўлена іх стаўленнем да працы.

Сёлета на Пружаншчыне прыступілі да работы 250 выпускнікоў вышэйшых, сярэдніх спецыяльных і прафесійна-тэхнічных устаноў адукацыі. З іх 120 чалавек прыйшлі ў аграпрамысловы комплекс.

У Ганцавіцкі раён у адпаведнасці з яго маштабамі выпускнікоў прыехала на парадак меней. Паводле слоў **старшыні раённага Савета Юрыя ШАПЕЛЯ,** пытанні работы з маладымі спецыялістамі заўсёды знаходзяцца ў полі зроку кіраўніцтва раёна. Іх разглядалі на сесіі райсавета ў мінулым скліканні, будуць яны разгледжаны і цяперашнім складам дэпутатаў. Перад згаданай сустрэчай спецыялісты райвыканкама выязджалі на месцы, знаёміліся з умовамі пражывання былых выпускнікоў, абагульнялі іх пажаданні і прапановы. І як заўсёды, гэтыя тэмы ўзнімаліся падчас сустрэчы.

Нярэдка на падобныя мерапрыемствы запрашаюць тых з учарашніх маладых спецыялістаў, якія ўжо зрабілі пэўныя поспехі ў прафесіі, вызначыліся з месцам далейшага пражывання, пра якіх кажуць, што яны замацаваліся. Вось з такімі давялося гутарыць не так даўно аўтару гэтых радкоў на Ганцаўшчыне.

Аліна Сапун прыйшла ў родную школу летась пасля заканчэння Пінскага каледжа мастацтваў, стала настаўніцай харэаграфіі. Работа ёй падабаецца, з жыллём праблем няма, бо дзяўчына жыве дома з бацькамі. Аліна сказала, што ведае дакладна: харэаграфія назаўсёды стане яе прафесіяй.

Варта адзначыць, што ва ўстановах адукацыі, культуры, аховы здароўя пасля абавязковай адпрацоўкі ў раёне застаецца больш за палову маладых спецыялістаў. Пагутарыла я і з двума ўрачамі, якія прыехалі па размеркаванні ў Ганцавічы і засталіся тут. Уладзімір Цанда — урач лабараторнай дыягностыкі, працуе загадчыкам лабараторыі. З жонкай, урачом-педыятрам, гадуюць дваіх дзяцей. Жывуць у службовай кватэры, якую атрымалі пасля прыезду на працу. Потым узялі ўчастак і сталі будаваць дом. Аналагічныя жыллёвыя ўмовы і ў калегі — доктара Дзяніса Саладухі. Яны з жонкай таксама будуюць уласнае жыллё. Медыкі з гонарам адзначалі, што ў іх бальніцы ўстаноўлена сучаснае дыягнастычнае абсталяванне, якое не саступае аналагам у Баранавічах або ў Брэсце. Адзін з іх у якасці набытку адзначыў шырокія магчымасці для практыкі, якую не атрымаеш у клініцы вялікага горада, дзе вузкая спецыялізацыя. А тут ты — амаль земскі доктар.

Вось як Андрэй Халецкі — выпускнік Віцебскага медыцынскага ўніверсітэта мінулага года. Андрэй прыехаў на работу і адразу стаў галоўным урачом Малькавіцкай сельскай участковай бальніцы. Прыём у паліклініцы, абслугоўванне выклікаў, выезд на два ФАПы, якія знаходзяцца ў зоне абслугоўвання ўчастка, стацыянар на 25 ложкаў — адным словам, работы маладому ўрачу хапае. Андрэй Аляксандравіч адразу зразумеў, што тут ён атрымае ўнікальны вопыт.

Нават тым, хто адпрацаваў год, не кажучы пра больш сталых калег, ёсць чым падзяліцца з сёлетнімі выпускнікамі медыцынскіх устаноў.

Работа ў глыбінцы для маладога спецыяліста гэта яшчэ і магчымасць для росту, часам імклівага прасоўвання па службовай лесвіцы, адзначалі на сустрэчы. Прыкладам можа паслужыць, пэўна, кар'ера Аляксея Дзічкі, ляснічага Хатыніцкага лясніцтва. За тры гады ён прайшоў розныя службовыя прыступкі і стаў кіраўніком калектыву з 16 чалавек, адказным за амаль 13 тысяч гектараў лясных угоддзяў. Аляксей мясцовы, жыве з бацькамі, на работу ездзіць з райцэнтра. Ён з дынастыі леснікоў, у лесе ў свой час працавалі дзяды і па бацькавай, і па матчынай лініі, дзядзькі. Таму хлопец з маленства не бачыў сябе ў іншай прафесіі, адказна рыхтаваўся да паступлення, пасняхова скончыў ВНУ.

Менавіта на сваіх, мясцовых выпускнікоў школ тут робяць стаўку. Дарэчы, з сёлетніх сотні маладых спецыялістаў 82 чалавекі — ураджэнцы Ганцаўшчыны. Ад імя ўлады старшыня райсавета Юрый Шапель выказаў намер усяляк падтрымліваць маладое папаўненне. Прыклад ёсць з каго браць, у каго вучыцца ёсць. Застаецца напрацоўваць уласны досвед, станавіцца сапраўдным майстрам сваёй справы, абзаводзіцца сям'ёй, жыллём і... заставацца.

**Святлана ЯСКЕВІЧ.**

# ПУБЛІЧНАСЦЬ І ТАЯМНІЦЫ ЭЛЕКТРОННАГА НАТАРЫЯТА

**Наколькі беларусы гатовыя да таго, каб зрабіць даступнымі больш звестак пра сябе, якія пакуль з'яўляюцца натарыяльнай тайнай, і ці ёсць пры гэтым абараніць персанальныя даныя? Як увогуле функцыянуюць электронныя і папяровыя дакументы? Над гэтымі і іншымі пытаннямі разважалі натарыусы і дэпутаты на выязным пасяджэнні, дзе на прыкладзе вопыту работы натарыяльнай канторы Жодзіна разгледзелі, як праходзіць інфарматызацыя натарыята і дзейнічаюць электронныя натарыяльныя пасведчанні.**



## Інфарматызацыя камунікацыі людзей і дзяржавы

3 1 студзеня 2017-га ў натарыяльных канторах і бюро створана адзіная электронная сістэма ўліку натарыяльных дзеянняў і адкрытых спадчынных спраў. Яна з'яўляецца часткай адзінай інфармацыйнай сістэмы (АІС) і пастаянна дапаўняецца. Напрыклад, унесены звесткі пра ўсе засведчаныя з 1 студзеня 2014 года даверанасці, спадчынныя справы, адкрытыя з 2009-га, завяшчанні, зацверджаныя з 2010-га, і шлюбныя дагаворы, заключаныя з 1999-га.

У канцы мінулага года ў Палату прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу паступіў законапраект, палажэнні якога скіраваны на ўдасканаленне працэсу інфарматызацыі. У ім прапануецца вызначыць формы ўзаемадзеяння АІС натарыята з дзяржаўнымі інфармацыйнымі сістэмамі, а таксама вызначыць спосабы доступу суб'ектаў інфармацыйных адносін (за выключэннем натарыусаў) да інфармацыі, што змяшчаецца ў АІС. Дакумент атрымаў шэраг заўваг і накіраваны на дапрацоўку.

— Для далейшага развіцця інфарматызацыі натарыяльных бюро і кантор неабходна ўкараненне сучасных формаў арганізацыі дзейнасці натарыусаў і стварэнне роўных магчымасцяў атрымання якасных паслуг натарыуса незалежна ад месца жыхарства чалавека. Пры гэтым нельга забываць на яго правы, каб не зрабіць звесткі, якія сёння з'яўляюцца таямніцай, агульнадаступнымі. Такія «людскія таямніцы» (адвакацкая і натарыяльная) павінны быць абаронены, нягледзячы на прасоўванне сучасных тэхналогій, — заўважыла **Наталля ГУЙВІК, старшыня Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Беларусі па заканадаўстве**, падкрэсліваючы важнасць тэмы, якая абмяркоўвалася.

Мэтай інфарматызацыі натарыусы бачаць развіццё эфектыўнай і празрыстай сістэмы дзяржаўнага кіравання праз укараненне інфармацыйна-камунікацыйных тэхналогій ва ўсе сферы дзейнасці. А таксама забеспячэнне зручнасці камунікацыі паміж грамадзянамі, бізнесам і дзяржавай шляхам пераводу гэтых стасункаў у электронную форму і фарміраванне адзінай інфармацыйнай прасторы для аказання электронных паслуг, адзначыла **Наталля БАРЫСЕНКА, старшыня Беларускай натарыяльнай палаты (БНП):**

— Адзіны электронны рэестр уліку натарыяльных дзеянняў і спадчынных спраў, які ўжо працуе, не дасць тых магчымасцяў, што адкрые комплексная электронная сістэма натарыята. Паколькі ўсе звесткі пра натарыяльныя дзеянні і адкрытыя спадчынныя справы ўносяцца ў АІС натарыята і пераходзяць у сферу электроннай камунікацыі, яго хуткасць і аб'ёмы ўзрастаюць. Тым самым павялічваецца неабходнасць у абароне правоў грамадзян. І мы б хацелі, каб натарыят стаў гарантам забеспячэння абароны гэтых правоў і распрацоўшчыкам сучасных публічных сэрвісаў і натарыяльных паслуг.

## «Спадчына без межаў»

Праз электронныя публічныя сэрвісы можна, напрыклад, праверыць факт адмены даверанасці або даведацца, куды звяртацца па пэўнай спадчыннай справе.

— Цяпер спадчынныя справы афармляюцца ў межах адной акругі, дзе можа быць шмат натарыусаў. Каб дапамагчы нашчадкам зразумець, у якую кантору і да якога спецыяліста звярнуцца, на сайце БНП на адпаведным лісце пра адкрытыя спадчынныя справы трэба ўвесці імя завяшчальніка. Калі справа існуе, адкрываецца інфармацыя па ёй: кім заведзена, з кім звязацца, — заўважыла старшыня БНП. — Часам здаралася, хоць і рэдка, што пасля аднаго памерлага заводзіліся дзве спадчынныя справы. Электронная сістэма дазваляе выключыць такое задваенне. У будучыні мы хацелі б арганізаваць работу па прынцыпе «спадчына без межаў». Нашчадкі змогуць звярнуцца да натарыуса незалежна ад таго, дзе жыў завяшчальнік. Такі вопыт ужо ёсць у Гродне і Брэсце.

— Мы хочам вывесці з паняцця «натарыяльнай таямніцы» больш звестак, каб зацікаўленыя праўралі даверанасць на яе сапраўднасць. Гэта дазволіць гарантаваць грамадзянам чысціню здзелкі на падставе гэтага дакумента, аднак не дасць убачыць яго змест, — падзялілася думкамі Наталля Барысенка. — Такі прыклад існуе ў Расіі, дзе дзяржорганы праз адсканаваную выяву могуць праверыць нават змястоўную частку даверанасці. Мы гатовыя рэалізаваць гэта і ў нас, і не трэба баяцца, што інфармацыя выйдзе за межы натарыяльнай таямніцы.

А вось ці гатовае наша грамадства выстаўляць у агульны доступ тое, што сёння лічыцца таямніцай? **Жанна ЗАХАРАВА, начальнік упраўлення натарыята і загсаў Міністэрства юстыцыі Беларусі**, назвала ініцыятыву натарыяльнай палаты добрай і правільнай:

— Мы маем шмат прапаноў ад банкаў наконт доступу да зместу даверанасці. Шмат выпадкаў існавання падложных даверанасцяў, бо ўзровень падробак даволі высокі, і доступ да зместу дакумента будзе добрым крокам. Аднак трэба рухацца асцярожна, каб вытрымаць баланс паміж тым, што мы маем, і менталітэтам беларусаў. Каб не даць зашмат інфармацыі пра чалавека для агульнага прагляду ўсімі грамадзянамі.

Прысутныя пагадзіліся, што ў кампетэнцыі менавіта дэпутатаў паразважаць, што яшчэ можна вывесці з паняцця таямніцы. Напрыклад, падумаць, ці дазволіць бачыць, колькі разоў чалавек быў у шлюбе ці што прапісана ў яго шлюбным дагаворы. Такая практыка — рэестр шлюбных дагавораў як агульнадаступны рэсурс — існуе ў Прыбалтыцы. Мясцовыя кажуць, што так яны абараняюць інтарэсы крэдытораў, бо ёсць розніца паміж сумесна нажытай маёмасцю і асабістай.

Пакуль натарыусы працуюць і з электроннымі, і з папяровымі дакументамі.

— Мы дагэтуль не адышлі ад папяровых носьбітаў, і няясна, ці трэба гэта будзе рабіць увогуле. Трэба яшчэ наладзіць працу сервераў для захоўвання інфармацыі, парадак яе ўтрымання, — паразважала Жанна Захарава. — Натарыяльная палата сумесна з Нацыянальным банкам цяпер рэалізоўвае тэхнічную магчымасць учынення дзеяння ў электронным выглядзе. Як атрымліваць такія дакументы, перадаваць іх далей. Пакуль не зусім ясна, наколькі здзейсненыя электронны выканаўчы надпіс будзе мець абарачальную здольнасць у дакументаабароце іншых органаў.

Тым не менш, нягледзячы на тое, што работы ў натарыусаў стала больш, электронны дакументаабарот палегчыў іх жыццё, бо ўнесеныя аднойчы ў сістэму звесткі застануцца ў ёй ужо назаўжды.

**Ірына СІДАРОК.**


Центр Промышленной Оценки
• Организация аукционов
• Оценка всех видов имущества

**Извещение о проведении повторного аукциона**

| | |
|---|---|
| **Организатор аукциона** | ЗАО «Центр промышленной оценки», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703 |
| **Продавец** | ОАО «Оршаагропроммаш», Витебская обл., г. Орша, ул. Ленина, 215 |

**Предмет аукциона**

**Лот №1** – Объекты недвижимого имущества, реализуемые одним лотом

| Наименование (назначение) | Общая площадь | Инв. номер |
|---|---|---|
| **Производственный корпус цеха** (здание специализированное для металлургического производства и металлообработки) | 16 006,4 кв. м | 110/С-110941 |
| Адрес: Брестская обл., г. Барановичи, ул. Кирова, д. 79/ 13 | | |
| **Площадка завода металлоконструкций** (сооружение специализированное автомобильного транспорта и автодорожного хозяйства) | 3 014,0 кв. м | 110/С-113604 |
| Адрес: г. Барановичи, ул. Кирова, д. 79, площадка завода металлоконструкций | | |
| **Открытый склад металла** (сооружение специализированное складов, хранилищ). Составные части и принадлежности: площадка | 1 723,0 кв. м | 110/С-112475 |
| Адрес: г. Барановичи, ул. Кирова, д. 79, открытый склад металла | | |
| **Ливневая канализация 1** (сооружение специализированное водохозяйственного назначения). Составные части: семнадцать трубопроводов (а1 – а17) | 879,5 м | 110/С-114664 |
| Адрес: г. Барановичи, ул. Кирова, 79, ливневая канализация 1 | | |
| **Ливневая канализация 2** (сооружение специализированное водохозяйственного назначения). Составные части: одиннадцать трубопроводов (а1 – а11) | 281,3 м | 110/С-114665 |
| Адрес: г. Барановичи, ул. Кирова, 79, ливневая канализация 2 | | |
| **Водопровод** (сооружение специализированное водохозяйственного назначения). Составные части: А – участок водопроводной сети: а1 – трубопровод, а2 – трубопровод, а3 – трубопровод ввод, а4 – трубопровод ввод, а5 – трубопровод ввод, а6 – трубопровод, а7 – трубопровод | 618,7 м | 110/С-114547 |
| Адрес: г. Барановичи, ул. Кирова, 79, водопровод | | |
| **Производственный водопровод** (сооружение специализированное водохозяйственного назначения). Составные части и принадлежности: А – водопроводная сеть: а1 – трубопровод, а2 – трубопровод, а3 – трубопровод ввод, а4 – трубопровод ввод, а5 – трубопровод ввод, а6 – трубопровод ввод, а7 – трубопровод, а8 – трубопровод ввод, а9 – трубопровод ввод, а10 – трубопровод ввод | 1 160,5 м | 110/С-114545 |
| Адрес: г. Барановичи, ул. Кирова, 79, производственный водопровод | | |
| **Хозяйственная фекальная канализация** (сооружение специализированное водохозяйственного назначения). Составные части и принадлежности: восемь трубопроводов | 1 053,8 м | 110/С-114546 |
| Адрес: г. Барановичи, ул. Кирова, 79, хозяйственная фекальная канализация | | |
| **Телефонизация (слаботочные сети)** (сооружение специализированное связи). Составные части и принадлежности: А – телефонизация (слаботочные сети), а1 – участок кабельной телефонизации, а2 – участок кабельной телефонизации | 514,5 м | 110/С-115057 |
| Адрес: г. Барановичи, ул. Кирова, 79, телефонизация (слаботочные сети) | | |
| **Кабельные линии электропередачи 10 кВ** (сооружение специализированное энергетики) | 862 м | 110/С-115059 |
| Адрес: г. Барановичи, ул. Кирова, 79, кабельные линии электропередачи 10 кВ | | |
| Трансформатор 630 Квт | – | – |
| Трансформатор 630 Квт | – | – |

***Сведения о земельном участке***: пл. **2,4736** га предоставлен продавцу для обслуживания производственного корпуса цеха, открытого склада металла, площадки завода металлоконструкций на праве постоянного пользования

**Начальная цена с НДС 20 % – 3 844 087,34 бел. руб. (снижена на 20 %)**

**Лот № 2** – Объекты недвижимого имущества, реализуемые одним лотом

| Наименование (назначение) | Общая площадь | Инв. номер |
|---|---|---|
| **Цех блоков** (здание неустановленного назначения). Составные части и принадлежности: подвал | 3 748 кв. м | 110/С-85251 |
| Адрес: г. Барановичи, ул. Кирова, д. 79 | | |
| **Автодорога бетонных блоков** (сооружение специализированное автомобильного транспорта и автодорожного хозяйства). Составные части: автодорога бетонных блоков (А), два покрытия (а1,а2) | 9 048 кв.м | 110/С-112843 |
| Адрес: г. Барановичи, ул. Кирова, д. 79, автодорога бетонных блоков | | |
| **Здание гаража** (здание специализированное автомобильного транспорта) | 30,5 кв. м | 110/С-111500 |
| Адрес: г. Барановичи, ул. Кирова, д. 79/ 16 | | |
| **Здание гаражей** (здание специализированное автомобильного транспорта) | 459,7 кв. м | 110/С-111499 |
| Адрес: г. Барановичи, ул. Кирова, д. 79/ 17 | | |
| **Открытый склад готовой продукции** (сооружение специализированное складов, хранилищ). Составные части: (А)-площадка | 4 226 кв. м | 110/С-112473 |
| Адрес: г. Барановичи, ул. Кирова, д. 79, открытый склад готовой продукции | | |
| **Склад извести** (здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ). Составные части: бетонный подвал, навес из металлических столбов, емкости | 119,6 кв. м | 110/С-111540 |
| Адрес: г. Барановичи, ул. Кирова, д. 79/ 26 | | |
| **Склад цемента** (здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ). Составные части: одноэтажное кирпичное здание склада цемента с подвалом и навесом | 63,0 кв. м | 110/С-85258 |
| Адрес: г. Барановичи, ул. Кирова, д. 79 | | |
| **Склад сыпучих материалов** (здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ). Составные части: две кирпичные пристройки, три бетонных, одна шиферная, одна из металлического каркаса обшитая шифером, два навеса | 1885,3 кв. м | 110/С-85261 |
| Адрес: г. Барановичи, ул. Кирова, д. 79/ 24 | | |

| | |
|---|---|
| **Сведения о земельных участках** | пл. **2,2139** га предоставлен продавцу для обслуживания цеха блоков, автодороги бетонных блоков, здания гаража, здания гаражей, открытого склада готовой продукции, склада извести, склада цемента, склада сыпучих материалов на праве постоянного пользования |
| | пл. **0,4901** га предоставлен продавцу для обслуживания склада сыпучих материалов на праве постоянного пользования |

**Начальная цена с НДС 20 % – 1 252 536, 34 бел. руб. (снижена на 20 %)**

С подробной информацией по предмету аукциона можно ознакомиться на сайте организатора аукциона WWW.CPO.BY

**Задаток 1 % от начальной цены лота** в белорусских рублях перечисляется на р/с № BY60BLBB30120191021390001001; в Дирекции «ОАО Белинвестбанк» по г. Минску и Минской области (адрес банка: г. Минск, ул. Коллекторная, 11), БИК BLBBBY2X, УНП 191021390, получатель платежа – ЗАО «Центр промышленной оценки»

**Срок подписания договора купли-продажи:** 10 рабочих дней после проведения аукциона

**Условия оплаты предмета аукциона**

Если между продавцом и покупателем (победитель аукциона либо единственный участник аукциона, согласившийся приобрести предмет аукциона по начальной цене, увеличенной на 5 %) в течение срока, установленного для подписания договора купли-продажи, не достигнута договоренность по срокам и о порядке оплаты за предмет аукциона, такая оплата должна быть произведена в течение **30 (тридцати) календарных дней** после заключения договора купли-продажи

Порядок проведения аукциона, оформления участия в аукционе, определения лица, выигравшего аукцион, а также возмещения затрат и оплаты вознаграждения за организацию аукциона, оговорен в Условиях его проведения, размещенных на сайте организатора торгов www.cpo.by

Организатор аукциона имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время до объявления его проданным без объяснения причин снятия

Предыдущее извещение о проведении аукциона опубликовано в газете «Звязда» 21.11.2018 г.

**Аукцион состоится 15.01.2019 в 12.00** по адресу: **г. Минск, ул. Мележа, д. 5/2, пом. 1703. Заявления на участие и необходимые документы принимаются по 14.01.2019 до 17.00** по указанному адресу

**Тел.: +375 17 280-36-37; 8 029 317-95-42. E-mail: auction@cpo.by**

# Што хвалюе?

## Працаўладкаванне, паляпшэнне жыллёвых умоў і аплата «камуналкі» праз пошту

**З пытаннямі на гэтыя тэмы прыйшлі жыхары горада на асабісты прыём грамадзян, які правёў у Калінкавічах, што на Гомельшчыне, дэпутат Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь Яўген АДАМЕНКА.**

Працаўладкаванне ў раёне выклікае пэўныя цяжкасці, піша раённая газета «Калінкавіцкія навіны», і не толькі таму, што не кожны наймальнік можа прапанаваць работніку адразу заробак у тысячу рублёў. Нярэдка падчас прыёму грамадзян даводзіцца чуць ад наведвальнікаў, што ім не падабаецца спецыяльнасць, якую яны атрымалі, таму хацелі б змяніць прафесію. Было б цалкам зразумела, калі б гэта была, скажам так, нейкая экзатычная спецыяльнасць, на якую няма попыту. Але не, цалкам распаўсюджаныя і нават запатрабаваныя спецыяльнасці. Напрыклад, настаўнік замежных моў.


knews.by

Звярнуліся да дэпутата і жыхары аднаго з мікрараёнаў горада, дзе ў сувязі з закрыццём цэнтра банкаўскіх паслуг няма магчымасці разлічыцца за «камуналку». Яўген Адаменка адразу патэлефанаваў начальніку РВЭС Віктару Палазніку, які пацвердзіў, што паміж банкаўскімі і паштовымі ўстановамі існуе дамоўленасць аб прыёме такой платы праз пошту. У дадзеным выпадку яе можна ўнесці праз паштальёнаў.

Са сваёй цяжкай жыццёвай сітуацыяй на прыём да Яўгена Адаменкі прыйшла маладая жанчына. Пасля скасавання шлюбу яна засталася з дзіцем і без свайго жылля.

Дэпутат прапанаваў заяўніцы варыянт засялення ў пакой інтэрната. Але тут высветлілася, што яна і працы не мае. А для атрымання пакоя ў інтэрнаце трэба хадайніцтва ад наймальніка. Такое вось зачараванае кола. Яўген Адаменка прапанаваў некалькі варыянтаў працаўладкавання на выбар жанчыны, які ёй трэба зрабіць.

Пасля заканчэння прыёму дэпутат адзначыў, што часам людзі па сваёй неабачлівасці трапляюць у складаную сітуацыю і ўжо не знаходзяць ніякага выхаду з яе. Таму чалавеку трэба дапамагчы сарыентавацца, падказаць выйсце, каб даць штуршок да далейшых самастойных дзеянняў. Бываюць, вядома, выпадкі, калі адзін і той жа заяўнік прыходзіць на прыём не раз і не два. Тут усё зразумела, такіх і раней звалі «летунамі». Такому цяжка будзе дапамагчы, пакуль ён не дапаможа сабе сам. Але часцей чалавеку дастаткова парады, адабрэння, простай падтрымкі, каб ён самастойна і ўпэўнена рухаўся далей.

АДКРЫЦЦІ

# Абноўленая радзільня і новы дом

**У Лельчыцах напярэдадні Новага года адбыліся адразу дзве значныя падзеі: пасля капітальнага рамонту адкрылася абноўленае радзільнае аддзяленне і заселены 40-кватэрны жылы дом сацыяльнага карыстання. Пра гэта паведамляе раённая газета «Светлае жыццё».**



Жанчыны, якія збіраюцца стаць матулямі, гэтай падзеі чакалі з нецярпеннем, паколькі найбліжэйшая радзільня знаходзіцца за 75 кіламетраў ад райцэнтра — у Мазыры. Былі выпадкі, калі жанчынам даводзілася ехаць нараджаць і ў Гомель. А наваспечаным мамам аднаго з самых аддаленых населеных пунктаў Лельчыцкага раёна — Дзяржынска, неабходна было пераадолець шлях 150 кіламетраў да Мазыра і больш за 300 да Гомеля.

— Пасля капітальнага рамонту ў Лельчыцкім радзільным аддзяленні створаны сучасныя ўмовы, як для медперсаналу, так і для мам з нованароджанымі. Перспектыва развіцця любога раёна немагчымая без рашэння сацыяльна значных пытанняў. А функцыянаванне радзільні ў Лельчыцкім раёне, з улікам аддаленых сельскіх населеных пунктаў, — гэта перш за ўсё магчымасць нараджэння будучага пакалення тых, якія прыйдуць пасля нас, — адзначыў **старшыня райвыканкама Анатоль ГАПОНІК.**

Дарэчы, пры Лельчыцкай цэнтральнай раённай бальніцы радзільня адкрылася 25 снежня 1992 года. За 16 гадоў будынак ні разу не рамантаваўся. Таму 2 мая 2018 года рашэннем раённага цэнтра гігіены і эпідэміялогіі яго закрылі на рамонт. Грошы ў суме 98 тысяч рублёў былі выдзелены з абласнога бюджэту. Па словах галоўнага ўрача Лельчыцкай цэнтральнай раённай бальніцы Аляксандра Гусака, адкрыццё абноўленага радзільнага аддзялення наблікалі ўсім калектывам: практычна кожнаму давялося папрацаваць на гэтым важным аб'екце, які ўплывае на павышэнне дэмаграфічнага ўзроўню.

Лельчыцкая радзільня разлічана на 15 ложка-месцаў. Іх хопіць для прыёму парадзіх з усяго раёна. Медыцынская ўстанова забяспечана медперсаналам у поўным аб'ёме, ёсць таксама кувез, абсталяваны сучаснай апаратурай для нованароджаных. Пакуль ішла апошняя падрыхтоўка да адкрыцця радзільні, у ёй ужо з'явіліся на свет трое малых — дзве дзяўчынкі і хлопчык. Так што парадзіхам, якія чакаюць папаўнення, ужо не давядзецца ехаць нараджаць за межы раёна, іх дзеці з'явяцца на свет на малой радзіме.



Днём пазней, 27 снежня, ключы ад 40 новых кватэр атрымалі тыя, хто адносіцца да катэгорыі сірот, а таксама шматдзетныя сем'і і сем'і, у якіх выхоўваюцца дзеці-інваліды. Будаўніцтва дома пачалося ў красавіку мінулага года, і ўжо пад канец 2018-га — 26 снежня — былі падпісаны акты ўводу ў эксплуатацыю. Жылы дом мае агульную плошчу больш за 2000 «квадратаў», і згодна з рашэннем райвыканкама, усе кватэры заселены ў поўным аб'ёме.


lelchitsy.by

З навасёламі адразу ж заключылі дагаворы на забеспячэнне газам, электраэнергіяй, на водаадвядзенне і водазабеспячэнне, камунальныя паслугі. Затым з кожным уладальнікам жылля складуць дагаворы найму.

Дом пабудавалі ў новым раёне. Побач — паліклініка, бальніца, школа, дзіцячы садок, крамы, што вельмі зручна для шматдзетных сем'яў.

# Святло, вада і ветлівыя адносіны

**Кола пытанняў, якія былі абмеркаваны на сустрэчы з калектывам РАУС і насельніцтвам у Хойніцкім цэнтры культуры падчас асабістага прыёму грамадзян старшынёй раённага Савета дэпутатаў Галінай БОНДАР, значнае.**

Як паведамляе раённая газета «Хойніцкія навіны», на сустрэчы з супрацоўнікамі райаддзела ўнутраных спраў старшыня райсавета акцэнтавала ўвагу на рэалізацыі нормаў Дэкрэта «Аб садзейнічанні занятасці насельніцтва», заклікала супрацоўнікаў РАУС, якія, як ніхто іншы, шчыльна ўзаемадзейнічаюць з насельніцтвам, актыўней растлумачваць грамадзянам неабходнасць працаўладкавацца, а таксама даваць інфармацыю, куды можна звярнуцца па садзейнічанне ў пошуку рабочага месца.

Сярод агучаных пытанняў — паляпшэнне якасці вады ў населеным пункце Судкова. Як растлумачыў прадстаўнік камунальнай службы, крыху дапамагае прамыўка водаправодных сетак. Аднак большы вынік будзе мець будаўніцтва станцыі абезжалезвання. Дарэчы, да 2025 года дзейнічае праграма «Чыстая вада», у межах якой і плануецца будаўніцтва такой станцыі ў Хойніцкім раёне.

Падчас прыёмаў прагучалі скаргі на адсутнасць асвятлення па вуліцы Берагавога (адпаведнай службе КЖУП «Хойніцкі камунальнік» даручана аператыўна вырашыць пытанне), на недастаткова гарачую, а то і ўвогуле адсутнасць гарачай вады па адрасе: Карла Маркса, 10 (камунальнікі пачалі ўстанаўліваць помпы, праблема будзе знята).

У Хойніках у цэнтры культуры прайшла прыём-сустрэча дэпутацкага корпуса і членаў пастаянна дзеючай камісіі па каардынацыі работы па садзейнічанні занятасці насельніцтва з жыхарамі. Усе мелі магчымасць задаць пытанні, атрымаць кансультацыю наконт работы камісіі, рэалізацыі нормаў Дэкрэта «Аб садзейнічанні занятасці насельніцтва».

«Прыходзьце ў прыёмны дзень», — такое даволі нетветлівае пажаданне пачула хайнічанка ў адным з кабінетаў упраўлення па працы, занятасці і сацыяльнай абароне райвыканкама, куды звярнулася, каб атрымаць даведку аб налічанай пенсіі. «Аднак жа ніякага распарадку дня, якіх-небудзь прыёмных часоў не ўказана. Ды і ўвогуле, якія могуць быць прыёмныя дні ў службе, якая ажыццяўляе сацыяльную абарону грамадзян?» — не разумее жанчына.

Таксама на сустрэчы растлумачылі алгарытм выключэння са спісаў грамадзян працаздольнага ўзросту, якія не занятыя ў эканоміцы: куды і да якога часу неабходна звяртацца, якія дакументы трэба падаваць.

МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ

**РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ № 15 ад 17 лютага 2009 года выдадзена Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.**

**Заснавальнікі:** Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».

**Дырэктар — галоўны рэдактар СУХАРУКАЎ Павел Якаўлевіч.**

**Адказны за выпуск: АНУФРЫЕВА В. А.**

Грамадскі савет: **ПАПКОЎ А. А.,** старшыня Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па рэгіянальнай палітыцы і мясцовым самакіраванні; **ЦУПРЫК Л. А.**, старшыня Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па дзяржаўным будаўніцтве, мясцовым самакіраванні і рэгламенце; **ПАПКО В. М.**, намеснік старшыні Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па міжнародных справах; **БЕЛЯКОЎ А. Э.**, намеснік старшыні Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па адукацыі, навуцы, культуры і сацыяльным развіцці; **ПАНАСЮК В. В.**, старшыня Мінскага гарадскога Савета дэпутатаў; **ДРЫЛЁНАК Т. Л.**, старшыня Лёзненскага раённага Савета дэпутатаў; **СУШЧАНКА М. Л.**, старшыня Глушанскага пасялковага Савета дэпутатаў Бабруйскага раёна.

**Выдавец — рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда»**

**АДРАС РЭДАКЦЫІ:**
220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.

**КАНТАКТНЫ ТЭЛЕФОН** 292 44 12;

**e-mail:** info@zviazda.by

**Газета адрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 02330/106 ад 03.04.2009. 220013, г. Мінск, пр. Незалежнасці, 79.**

**Тыраж 20.008.** **Нумар падпісаны ў 19.30 3 студзеня 2019 года.**